

ГАЙНА — ВІЗІТОЎКА ДЛЯ ГАСЦЕЙ 6

АПОРА ДЛЯ НАРОДА І ЎЛАДЫ МС



Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

2 ЛІСТАПАДА 2022 г.
СЕРАДА
№ 215 (29837)

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

## КОРАТКА

• **Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў Луіса Лулу да Сілву з перавыбраннем Прэзідэнтам Бразіліі.**

• Рэгіянальныя адборы да конкурсаў «Славянскага базару» стартуюць у лістападзе.

• **Белкаапсаюз мае намер да канца 2025 года павялічыць рэалізацыю экалагічна бяспечнага посуду да 70 працэнтаў.**

• Мінспорту аб'явіла конкурс на візуальны сімвал II Гульняў краін СНД.

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Раман ГАЛОЎЧАНКА, прэм'ер-міністр:**

*«Умацаванне еўразійскага супрацоўніцтва паскарае рух да шматпалярнага светапарадку і адыгрывае вялікую ролю ў станаўленні адкрытай шматбаковай гандлёвай сістэмы. Як нядаўна адзначыў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, у свеце настаў час Азіі і важна яго не ўпусціць. На фоне павышанай канфліктагеннасці заходняга свету як ніколі важна і паслядоўнае пашырэнне дыялогу, супрацоўніцтва паміж еўразійскімі аб'яднаннямі. Гэтыя міжнародныя пляцоўкі даюць свету адчуць, што акрамя Захаду, які па-ранейшаму жыве менталітэтам сваёй перавагі і дамінавання, ёсць і іншыя цэнтры сілы, якія чуюць голас усіх без выключэння ўдзельнікаў, паважаюць гістарычныя, культурныя і нацыянальныя асаблівасці дзяржавы».*

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

# «Трэба супакоіцца і дамовіцца — вось мая пазіцыя»

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з генеральным сакратаром Арганізацыі Дагавора аб калектыўнай бяспецы Станіславам Засем. Падчас яе кіраўнік дзяржавы шчыра выказаўся аб армяна-азербайджанскім канфлікце і аб праблемах у АДКБ.**



Фота БелТА.

На пачатку сустрэчы Станіслаў Зась заўважыў, што тры гады для знаходжання аднаго чалавека на пасадзе генсека АДКБ — тэрмін недастатковы. Па яго словах, напрамкаў работы вельмі шмат і за тры гады ахапіць іх усе і адчуваць сябе ўпэўнена вельмі цяжка.

«Гэта мы абмяркуем на найбліжэйшым пасяджэнні, добра, што сказаў. Я так разумею, што мы не адмяняем чарговае пасяджэнне АДКБ, якое 23 лістапада адбудзецца. У нас ёсць свая пазіцыя ў гэтым плане», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Аднак тэма рабочай сустрэчы была больш глабальнай, чым хуткае пасяджэнне. Галоўнай тэмай стала сітуацыя на армяна-азербайджанскай граніцы, якой у мінулую пятніцу было прысвечана пасяджэнне Савета калектыўнай бяспекі АДКБ. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што на армяна-азербайджанскай граніцы быў і сам генсек АДКБ, і начальнік Аб'яднанага штаба. Па яго словах, ніхто лепей за гэтых спецыялістаў у сітуацыі не разбярэцца. «Вы ўцягнутыя ў гэты працэс, вы бачыце, што там адбываецца. Ну дык назірайце і дакладвайце. Навошта яшчэ туды пасылаць нейкіх назіральнікаў ад Беларусі, Расіі ды іншых? Чаго там целяпацца каля Расіі? Скончылася вайна, зразумела, чым скончылася. Вызначыліся бакі, што ім патрэбен пасрэднік, груба кажучы. Гэта норма, класіка. Натуральна, гэта Расія. Звярнуліся да Расіі... Расійскія пагранічнікі, як сказаў Пуцін, знаходзяцца на ўсіх участках граніцы, і з Турцыяй, і з Іранам, і з Азербайджанам, і гэтак далей. Што яшчэ трэба? Няхай у гэтым напрамку працуюць», — заявіў беларускі лідар.

СТАР. 2

«Звязда». 105 гадоў: адрасы газеты

# ЗЯМЛЯ ГЕРОЯЎ І МЕСЦА ПОДЗВІГУ

## Чым славіцца Любанскі край і чаму ён не чужы для «звяздоўцаў»?





Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

У вёсцы Дварэц Любанскага раёна выйшлі першыя нумары «Звязды» і «Чырвонай змены» ў партызанскай зоне.

**Адным з адрасоў ваеннай біяграфіі газеты «Звязда» з'яўляецца Любаншчына. На гэтай зямлі, якая ў гады Вялікай Айчыннай вайны стала партызанскім краем, пасля трагічнага правалу ў акупаваным Мінску працягнула свой выхад найстарэйшае рэспубліканскае выданне. Першы нумар «Звязды»-партызанкі выйшаў 27 студзеня 1943 года. Праз некалькі дзён — 31 студзеня 1943-га — у Любанскім раёне аднавіла сваю дзейнасць, спыненую вайной, і найбольш аўтарытэтная, папулярная па тым часе маладзёжная газета — «Чырвоная змена».**

СТАР. 5



Прыкметы часу

# «ГЭТА НЕ ЧУЖАЯ, ГЭТА НАША БАБУЛЯ...»

## Што рухае тымі, хто апякуе пажылых людзей?

**Замяшчальныя сем'і для пажылых людзей і асоб з інваліднасцю з'явіліся ў нашай краіне ў 2017 годзе. Новая форма сацыяльнага абслугоўвання ў большасці выпадкаў не прадугледжвае фінансавай падтрымкі: апеку і догляд за адзінокімі пажылымі людзьмі і інвалідамі замяшчальная сям'я часцей за ўсё бярэ на сябе бязвыплатна. Навошта людзі рашаюцца на дадатковыя клопаты і велізарную адказнасць? Каб разабрацца ў гэтым, адправімся ў невялікі гарадок Кіраўск, цэнтр аднайменнага раёна Магілёўскай вобласці. Бо ў дадзенай з'явы ёсць дзве цікавыя асаблівасці, расказалі работнікі сферы сацыяльнай абароны: па-першае, пажылых людзей «усынаўляць» часцей людзі даволі сталага ўзросту — бліжэй да пажылога, і па-другое, гэта ў большай ступені ўласціва сельскай мясцовасці, чым вялікім гарадам.**

СТАР. 4

ISSN 1990 — 763X

# «Трэба супакоіцца і дамовіцца — вось мая пазіцыя»

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

На пасяджэнні Савета калектыўнай бяспекі ў пятніцу Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што тут ідзе нейкая гульня. Але гульні быць не можа, паколькі вырашаецца пытанне вайны і міру. Падчас рабочай сустрэчы з генсекам АДКБ ён падкрэсліў, што нездарма тады сказаў пра гульню: «Я разумею, якая гульня. Навошта туды ўцягнулі Еўрасаюз, навошта туды цягнуць АБСЕ? Ну навошта? Зразумела ж, навошта. Што яны там будуць рабіць, калі там ужо ёсць пасярэднік? І яшчэ АДКБ туды трэба ўцягнуць, нібы больш няма чым займацца».

### Вырашылі мірыцца — трэба мірыцца

Прэзідэнт расказаў, чаму так востра рэагуе на гэтае пытанне. У свой час, калі Беларусь чарговы раз старшынствавала ў АДКБ, Аляксандр Лукашэнка заняўся гэтым пытаннем. Ён сустрэўся з прэзідэнтам Азербайджана Ільхамам Аліевым. «Я яму задаў пытанне так, жартуючы: «Ільхам Гейдаравіч, ну трэба Арменіі дапамагчы, калі дамовіцеся». Размова ішла аб пяці ці шасці азербайджанскіх раёнах, якія былі, як канстатавалі, захопленыя армянамі. Армяне прызналі, што гэта азербайджанская зямля, акрамя Карабаха. Ну дык вярні яе. І калі б тады, калі я прапанаваў гэта зрабіць, вярнулі гэтыя раёны — вайны б не было. У Ільхама *(Аліева. — «Зв.»)* не было, груба кажучы, матывацыі пачынаць гэтую вайну. Ну ты прасіў гэтыя раёны — вярнулі. Застаўся статус Карабаха. Вырашалі б у спакойным рэжыме. Тады ж не пагадзіўся ні Серж Саргсян *(былы Прэзідэнт Арменіі. — «Зв.»)*, ні потым Нікол Пашынян *(цяперашні прэм'ер-міністр Арменіі. — «Зв.»)*», — расказаў Аляксандр Лукашэнка. Гэтае пытанне ён падымаў двойчы. Нават прапаноўваў Ільхаму Аліеву ў выпадку вырашэння канфлікту падумаць над інвестыцыямі ў Арменію, каб канчаткова памірыцца. Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў той жа час будавалі трубаправоды, якія правялі ў абыход Арменіі. А Ільхам Аліеў прапаноўваў правесці іх праз Арменію, гэта быў больш выгадны і зручны варыянт. Але армянскі бок не пагадзіўся.

«Ну і што. Паставілі прэзідэнта Азербайджана ў вугал. Яму не заставалася іншага рашэння як сілавое. Далей цягнуць нельга было — больш за мільён бежанцаў стварылі напружанне. Вось у чым сутнасць», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка. Па яго словах, як дасведчаны ў палітыцы чалавек, ён гэта выдатна бачыў і разумеў.

«Ну што зараз гуляць. Цяпер трэба канчаткова, калі вырашылі мірыцца — трэба мірыцца і не трэба прыдумляць. Недзе ў гарах, як мне расказвалі, дзеляць гэтую мяжу. Ну якія горы? Быццам бы сёння з гэтым Карабахам вырашылі, але пакуль Расія забяспечвае гэты працэс. Ну навошта зараз забіваць адзін аднаго? Амаль 300 чалавек забілі і яшчэ аб чымсьці разважаюць. Трэба супакоіцца і дамовіцца — вось мая пазіцыя. Адтуль, з далёкіх часоў — 10 з лішнім гадоў таму назад. Таму я так жорстка рэагую на гэта. Але канфлікт гэты трэба заканчваць. І не дай бог, мы яшчэ будзем распальваць канфлікт на таджыкска-кіргізскай мяжы — гэта таксама недапушчальна», — канстатаваў беларускі лідар.

Ён упэўнены, што гэтыя канфлікты трэба заканчваць. Па словах Прэзідэнта, гэта не справа, калі ў рамках АДКБ існуюць канфлікты. Гэтыя пытанні будуць абмеркаваны на чарговай сесіі АДКБ. Таксама беларускім бокам туды вынесены і іншыя пытанні, у тым ліку па сродках масавай інфармацыі, па прагназаванні, па інфармаванні на крызісныя сітуацыі. Шмат пытанняў. «І каб нас там не называлі «папяровым тыграм» ці яшчэ неяк — трэба актывізавацца тут. Калі хтосьці не жадае працаваць — Бог з ім. Але трэба працаваць з тымі, хто хоча ў АДКБ працаваць, і забіць раз і назаўжды гэты жалезабетонны кол ці слуп, вакол якога мы ўсе будзем круціцца, і паказваць усяму свету, што ёсць такая ваенна-палітычная арганізацыя. Мы за гэта. Але без усяляких гульняў і выкарыстання АДКБ у вырашэнні ўнутраных палітычных праблем. Яны ва сваіх ёсць. Але ў нас АДКБ не для гэтага створана», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Станіслаў Зась, вяртаючыся да сітуацыі на армяна-азербайджанскай граніцы, расказаў, што неаднаразова бываў у Азербайджане. «Я бачыў, што краіна актыўна рыхтуецца да сілавога варыянта. Калі я казаў, што пытанне трэба перагаворамі вырашаць, адказ быў просты: «Мы 30 гадоў спрабуем дамовіцца, колькі яшчэ гадоў можна перагаворы весці». Сітуацыя выспявала — і атрымалася тое, што атрымалася. На жаль, не маглі мірам вырашыць. Вось такое вырашэнне пытання», — сказаў ён.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### У тэму

#### Прыярытэты не павінны быць абстрактныя

Пасля рабочай сустрэчы з Прэзідэнтам **генеральны сакратар АДКБ Станіслаў ЗАСЬ** пагутарыў з журналістамі. Паводле яго слоў, у наступным годзе Беларусь будзе старшынстваваць у АДКБ і цяпер ужо на завяршальным этапе работа па падрыхтоўцы прыярытэтаў. «Патрабаванне ў кіраўніка дзяржавы традыцыйна простае і зразумелае: прыярытэты не павінны быць абстрактныя, надуманыя. Яны павінны датычыцца менавіта тых праблем, якія на парадку дня нашай арганізацыі, надзённых праблем, з якімі сутыкаецца арганізацыя сёння», — расказаў ён.

Вядучай тэмай сустрэчы з кіраўніком дзяржавы стала абстаноўка ў зоне адказнасці АДКБ. Гэта датычыцца і каўказскага рэгіёна. Станіслаў Зась праінфармаваў Прэзідэнта аб выніках работы місіі АДКБ, якая па даручэнні Савета калектыўнай бяспекі працавала ў Арменіі. На нечарговым саміце кіраўнікоў дзяржаў АДКБ 28 кастрычніка абмяркоўваліся прапановы па выніках работы місіі. Па словах генсека АДКБ, размова не завершана, ідзе дапрацоўка гэтых прапаноў. Тэма будзе абмеркавана і на саміце АДКБ у лістападзе.

Станіслаў Зась і Аляксандр Лукашэнка абмеркавалі абстаноўку на граніцы Кыргызстана і Таджыкістана і магчымыя крокі АДКБ у інтарэсах яе стабілізацыі. Удзялялася ўвага і няпростай сітуацыі ва ўсходнееўрапейскім рэгіёне. Генеральны сакратар АДКБ выказаў падзяку кіраўніку беларускай дзяржавы за працяглую шчырую размову: «Павінен адзначыць, што такі прамы падыход, сумленны і адкрыты, быў прадэманстраваны і ў ходзе праведзенага саміту кіраўнікоў дзяржаў АДКБ на мінулым тыдні».

## Парламенцкі дзённік

# ПРАЦАВАЦЬ НА ВЫНІК ВА ЎСІХ ФАРМАТАХ

**ААЭ — адзін з галоўных партнёраў Беларусі ў арабскім рэгіёне, заявіў Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка ў час сустрэчы з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Рэспубліцы Беларусь Ібрагімам Салімам Махамедам аль-Мушарахам, паведамляе БелТА.**



Фота БелТА.

Асаблівую ўвагу падчас сустрэчы спікер ніжняй палаты беларускага парламента надаў міжпарламенцкім адносінам дзвюх краін. «Парламентарыі Беларусі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў павінны больш актыўна ўзаемадзейнічаць як у двухбаковым фармаце, так і ў рамках міжпарламенцкіх структур. У нас створаны рабочыя групы па супрацоўніцтве. І было б правільна, калі б гэтыя групы ў найбліжэйшы час адпрацавалі пагадненне аб супрацоўніцтве паміж парламентамі нашых дзяржаў. Добра было б потым падпісаць гэта пагадненне ў час візіту старшыні Федэральнага нацыянальнага савета Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў у Беларусь, — сказаў ён. — Мы хацелі б, каб вы былі ўключаны ў рэалізацыю гэтай прапановы, гэтай ініцыятывы. Парламентарыям трэба таксама больш актыўны ўдзел прымаць у рабоце сумеснага камітэта па супрацоўніцтве паміж урадамі. Цяпер ідзе падрыхтоўка да пасяджэння шостага камітэта, які адбудзецца ў 2023 годзе. У нас там будзе магчымасць зверыць гадзіннікі і вызначыць перспектывы па новым напрамку работы».

«Напрамкаў работы вельмі шмат. Гэта, вядома, развіццё гандлю, прыцягненне інвестыцый, гуманітарная дзейнасць, пытанні турызму і развіцця дагаворна-прававой базы. Гэта значыць, работа ў нас чакаецца цікавая, мы гатовы і зацікаўлены ў развіцці ўсіх гэтых адносін», — канстатаваў спікер.

Бакі абмеркавалі на сустрэчы пытанні беларуска-эмірацкіх адносін, у тым ліку па лініі заканадаўчых органаў, умацавання гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва, узаемнай падтрымкі ў міжнародных арганізацыях.

## Ігар СЕРГЕЕНКА:

# «РОБІМ УСЁ, КАБ НЕ БЫЦЬ УЦЯГНУТЫМІ Ў КАНФЛІКТ»

**Пытанні бяспекі ва ўмовах ваенна-палітычнага становішча, якое складваецца вакол краіны, было разгледжана на сустрэчы вышэйшых службовых асоб Беларусі з працоўнымі калектывамі Магілёва ў Палацы культуры вобласці.**

— Сёння мы сустракаемся для таго, каб расказаць, што робіць краіна, каб не быць уцягнутай у канфлікт, — адзначыў **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар СЕРГЕЕНКА.** — За 80 гадоў пасля Вялікай Айчыннай вайны мы прывыклі да дастатку і стабільнасці. Але ўвесь гэты час краіна падвяргалася санкцыям. Мы не дапусцілі сацыяльнага расслаення насельніцтва, нашы прадпрыемствы працуюць. Да сёмага лістапада плануецца адкрыць па краіне больш за 20 сацыяльных аб'ектаў. Летась і сёлета быў здадзены шэраг медыцынскіх аб'ектаў у Магілёве, будаўніцтва працягнецца. Ва ўмовах санкцый Беларусь нарошчвае аб'ёмы тавараў і паслуг. Але не ўсім падабаецца гэтая незалежнасць, таму калектыўны Захад і ЗША робяць усё для напружання абстаноўкі. Сёння мы перажываем трывожны час. У суседніх еўрапейскіх краінах назіраецца інтэнсіўная мілітарызацыя, нарастае дзейнасць рэзідэнтуры. Два гады таму ў Беларусі не атрымалася зрабіць рэвалюцыйнага перавароту, зараз робяцца спробы прымяніць сілавы прыём. Але Беларусь нікому не пагражае і не хоча вайны. Нашы планы — абарона. Мы робім усё для таго, каб яна была надзейнай.

**Міністр абароны генерал-лейтэнант Віктар ХРЭНІН** падрабязна расказаў, як вядзецца эскалацыя ўзбраення ў суседніх з Беларуссю краінах.

— Ведучы разведку, мы яшчэ год таму бачылі, як нарастае напружанасць, — падкрэсліў ён. — На заклікі да розуму недружалюбныя нам краіны не рэагуюць. Войскі НАТА на граніцы асвойваюць тэрыторыю на меркаваным плацдарме. Іх самалёты і караблі здольныя наносіць удары на ўсёй тэрыторыі Беларусі. Ударнымі тэмпамі развіваецца ваенная інфраструктура, мабільныя лагеры, дзе можна размясціць некалькі тысяч вайскоўцаў.

Адпрацоўваюцца дзеянні не абарончыя, а наступальныя. У гібрыднай вайне задзейнічаны інфармацыйныя каналы. Прапрацоўваюцца варыянты, як разгайдаць краіну, сутыкнуць ілбамі беларусаў.

Генерал-лейтэнант паведаміў, што Беларусь сёння робіць упор на стратэгічнае стрымліванне ваеннай пагрозы. У краіне пачалося паэтапнае разгортванне рэгіянальнай групоўкі Расіі і Беларусі.

— Гэта робіцца, каб забяспечыць бяспеку для краіны, — падкрэсліў военачальнік. — Аснова ж нашай ваеннай палітыкі — не бразгаць зброяй, а садзіцца за стол перагавораў.

Абмяркоўваючы існуючую ваенна-палітычную абстаноўку вакол краіны, **старшыня Камітэта дзяржбяспекі Іван ТЭРТЭЛЬ** адзначыў, што людзі павінны ведаць, што адбываецца вакол Беларусі, таму падобныя сустрэчы праходзяць па ўсёй краіне.

— Як кіраўнік спецслужбы заўважу, што сённяшняя абстаноўка нагадвае сітуацыю перад Першай і Другой сусветнымі войнамі, — рэзюмаваў ён. — Паўсюль ствараюцца кааліцыі. Але ЗША пралічыліся, што абмен ядзернымі ўдарамі згубны для ўсёй планеты. Таму ёсць спадзяванні, што розум возьме верх. Сітуацыя пакуль стабільная, але, мяркуючы па сённяшніх дзеяннях, будзе абвастрацца. Робяцца спробы падарваць абстаноўку ўнутры краіны. Дэструктыўныя сілы Беларусі, якім не атрымалася перамагчы два гады таму, плануюць узяць рэванш пад лозунгам «Для аднаўлення законнасці ў Беларусі».

З аналізам міжнароднай абстаноўкі выступілі перад працоўнымі **старшыня Дзяржаўнага пагранічнага камітэта Анатоль ЛАПО** і іншыя.

Як адзначыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Ігар Сергеенка, Аляксандр Лукашэнка даў даручэнне азнаёміць беларусаў з той няпростай абстаноўкай, якая складваецца вакол краіны. Для таго, каб пазбегнуць канфлікту, нельга дапусціць уцягвання ў апазіцыю прадстаўнікоў працоўных калектываў. «Сітуацыя пад кантролем. Кожны на сваім месцы павінен займацца сваёй справай, гаворыць Прэзідэнт», — удакладніў Ігар Сергеенка.

Удзел у размове прынялі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Мартынюк.

Перад пачаткам мерапрыемства кіраўніцтва вобласці і краіны азнаёмілася з выставай на тэму генацыду, падрыхтаваную абласным мастацкім музеем імя П. Масленікава і ўпраўленнем КДБ па Магілёўскай вобласці.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Кантэкст

# «ВЫ ЎВОЙДЗЕЦЕ Ў ГІСТОРЫЮ НЕ ЯК ПАЛІТЫКІ, А ЯК ЗЛАЧЫНЦЫ І СЕРЫЙНЫЯ ЗАБОЙЦЫ»

## Моцная прамова пастаяннага прадстаўніка Беларусі пры ААН Валянціна Рыбакова на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН

**На працягу вось ужо многіх гадоў супраць Беларусі заходнімі дзяржавамі вядзецца шырокамаштабная вайна — палітычная, эканамічная, інфармацыйная. Аб гэтым заявіў пастаянны прадстаўнік Беларусі пры ААН Валянцін РЫБАКОЎ на пасяджэнні Савета Бяспекі ААН па тэме інцыдэнту з Ryanair, паведамілі ў Міністэрстве замежных спраў.**

«У парушэнне Статута ААН, міжнароднага права выкарыстоўваецца эканамічны тэрарызм — уведзены шматлікія санкцыі з мэтай эканамічнага ўдушэння краіны і яе народа. Груба парушаны ў тым ліку і палажэнні Будапешцкага мемарандума, на які ў гэтай зале так часта любяць спасылацца некаторыя дэлегацыі і па якім Беларусь добраахвотна адмовілася ад валодання самай сучаснай на той момант ядзернай зброяй, так у выніку нічога ўзамен і не атрымаўшы».

«Правядзенне сённяшняга пасяджэння — чарговае праяўленне гэтай вайны», — заўважыў Валянцін Рыбакоў. — Само стварэнне рабочай групы ІКАО па расследаванні з мэтай устанаўлення фактаў адносна выпадку з самалётам авіякампаніі Ryanair у паветранай прасторы Беларусі 23 мая 2021 года супярэчыць мандату арганізацыі і стварае небяспечны прэцэдэнт у маніпуляванні асновамі бяспекі грамадзянскай авіяцыі, — падкрэсліў Валянцін Рыбакоў. — Згаданы даклад, у спешцы напісаны пад націскам асобных краін Захаду, з'яўляецца некансэнсусным, прадузятым і мае неаб'ектыўны характар, на што звернута ўвага і ўдзельнікамі 41-й сесіі Асамблеі ІКАО, якая нядаўна адбылася. Пазіцыя Рэспублікі Беларусь адносна даклада распаўсюджана сакратарыятам, пра што сёння гаварылася, у якасці афіцыйнага дакумента Генеральнай асамблеі па пункце 88 парадку дня «Умацаванне і заахвочванне міжнароднага дагаворнага рэжыму» ад 27 ліпеня 2022 года пад нумарам A/76/909».

Пры гэтым пастаянны прадстаўнік Беларусі заявіў, што «Беларусь ніколі не згодзіцца з высновамі даклада, якія заснаваны на няпоўнай інфармацыі пры адсутнасці неабходнага міжнароднага супрацоўніцтва, пра што, дарэчы, заяўляецца ў самім дакладзе». «Адказы на ключавыя пытанні, накіраваныя ў адрас іншых уключаных краін у мэтах правядзення аб'ектыўнага і ўсебаковага расследавання, намі так і не былі атрыманы. Дадатковая інфармацыя ад беларускага боку зусім не запытвалася. Даклад мае шмат памылак, недакладнасцяў, неавіяцыйных і неаб'ектыўных падыходаў, — адзначыў Валянцін Рыбакоў. — Выкарыстанне ў дакладзе інфармацыі ад ананімнай крыніцы пры адсутнасці належнай тэхнічнай экспертызы з'яўляецца недапушчальным. У сваю чаргу пісьмовыя паказанні сапраўднага авіядыспетчара, перададзеныя належным чынам беларускім бокам у адрас ІКАО, не былі ўлічаны».

Беларускі бок заявіў, што змест прадастаўленага ўладамі ЗША ў адрас рабочай групы нібыта аўдыязапісу, зробленага нібыта авіядыспетчарам, з'яўляецца падманам і падробкай. Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь таксама адзначыў: «Цяпер самае важнае. Сама рабочая група прызнае, што ў паветранай прасторы Беларусі не было ні суправаджэння, ні перахопу, ні прымушэння да пасадкі самалёта авіякампаніі Ryanair якім-небудзь ваенным паветраным суднам, што сведчыць аб тым, што камандзір замежнага паветранага судна асабіста і самастойна прыняў рашэнне аб выкананні пасадкі ў аэрапорце горада Мінска. Усе гэтыя бясспрэчныя факты, дарэчы, прызнаныя рабочай групай, нікольні не перашкодзілі заходнім дзяржавам тут жа абвінавачваць Беларусь у прымусовай пасадцы самалёта».

«Тут сёння прагучалі словы «паветраны тэрарызм». Практычна адразу ж былі ўведзены санкцыі не толькі супраць беларускага нацыянальнага авіяперавозчыка авіякампаніі «Белавія», але і супраць сваіх нацыянальных перавозчыкаў, якім забаранілі выкарыстоўваць беларускую паветраную прастору, — заўважыў Валянцін Рыбакоў. — Я хачу вам нагадаць, што авіякампанія «Белавія», дарэчы, была ледзь не адзінай, якая перавозіла і ратавала грамадзян вашых краін па вашай просьбе ў час пандэміі і татальных лакдаўнаў, за што атрымлівала потым шматлікія падзякі ад грамадзян і прадстаўнікоў вашых дзяржаў».

Пастаянны прадстаўнік Рэспублікі Беларусь нагадаў аб незаконных санкцыях у дачыненні да беларускіх калійных угнаенняў. «Калійныя ўгнаенні — залог будучых ураджаяў. Недахоп гэтых прадуктаў на сусветных рынках, а Беларусь па асобных статыстычных падліках займае да трэціны іх сусветнай вытворчасці, прывядзе да гібелі ад голаду дадаткова дзясяткаў мільёнаў людзей. Я хацеў бы звярнуцца да тых, хто распрацоўвае і рэалізоўвае гэтыя санкцыі: вы пазбаўляеце людзей асноўнага права — права на жыццё. Але пасля гэтага маеце нахабства павучаць нас, як выконваць правы чалавека ў вашым разуменні», — заявіў Валянцін Рыбакоў. — Рана ці позна вы будзеце проста змецены альбо ўласнымі народамі, альбо мільёнамі тых, хто прыйдзе да вас з краін, якія вы сёння разбураеце. І прыйдуць гэтыя людзі да вас не за міфічнымі правамі чалавека ў вашым разуменні, а за кавалкам хлеба, каб накарміць свае сем'і, сваіх дзяцей. А вы, я думаю, увойдзеце ў гісторыю не як палітыкі, а як злачынцы і серыйныя забойцы».

**Пётр ДУНЬКО.**

Сапраўдны цуд!

# «ХЛОПЧЫК НАШ — ПРОСТА КОСМАСАМ ПАСЛАНЫ»

## Упаў з 9-га паверха, выжыў, ідзе на папраўку...

**«Звязда» працягвае сачыць за лёсам двухгадовага хлопчыка, які выпаў з акна дзявятага паверха шматпавярховіка ў Светлагорску. Нагадаем, што на трэці дзень пасля здарэння дзіця было пераведзена з райцэнтра на лячэнне ў Гомельскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу. Сёння маленькі пацыент працягвае лячэнне ў артапедычна-траўматалагічным аддзяленні. Медыкі, пры ўсім прынцыповым стаўленні да папярэдніх прагнозаў, канстатуюць: малы нарадзіўся ў кашулі. Падзенне з такой вышыні цудам абярнулася для хлопчыка: толькі пераломам бядра і страсеннем мозгу. Малы хутка ідзе на папраўку, і ўжо ў палаце гарэзу трэба перасцерагаць ад празмернай актыўнасці.**



Фота БелТА.

### «Фізіка» неверагоднага

Яшчэ каля дзесяці дзён хлопчыку належыць працягнуць лячэнне ў бальніцы. Неабходна вытрымаць «перыяд стабілізацыі пералому» — пераканацца, што косць дакладна пачынае зрастацца і прычын для знаходжання ў стацыянары больш няма, патлумачыў карэспандэнту «Звязды» **галоўны ўрач Гомельскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Вячаслаў ІЖАКОЎСКІ.**

— У малога пры падзенні было моцна траўміравана бядро, праведзена аперацыя — у нагу ўстаноўлены сінтэтычныя штыфты для зрастання косці. Праз дзесяць дзён плануем накладваць гіпс, каб нага заставалася нерухомай. У канцы наступнага тыдня будзем вырашаць, ці ёсць неабходныя падставы для выпіскі пацыента дадому, — сказаў доктар.

Хлопчыку прыйдзецца мірыцца з зафіксаванай нагой у гіпсе, магчыма, да паўгода.

— Выпадак дужа незвычайны, — працягвае кіраўнік галоўнай дзіцячай медустановы рэгіёна. — Незвычайны ён тым, што пры такім падзенні дзіця атрымала комплексную кататраўму (цялесныя пашкоджанні з-за падзення з вялікай вышыні), але ўсё абышлося без чэрапна-мазгавой траўмы. У нашай практыцы былі выпадкі лячэння падобных маленькіх пацыентаў, якія падалі з сёмага, восьмага паверхаў, але такія сітуацыі заўсёды заканчваліся складанымі чэрапна-мазгавымі траўмамі. Магчыма, добраму зыходу сітуацыі ў дадзеным выпадку паспрыялі пластычныя сківі... сіхльнасці — асаблівасці цела дзіцяці. Сёння працэс яго выздараўлення ідзе станоўча, — звярнуў увагу Вячаслаў Іжакоўскі.

### Сацыяльны кантроль

На сігнал аб здарэнні з малалетнім у Светлагорску аператыўна адрэагавала **намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх райвыканкама Наталля КЕНДЫШ.** Спецыяліст падрабязна растлумачыла алгарытм дзеянняў службаў аховы дзяцінства ў падобных выпадках.

— Педыятрычная служба перадала інфармацыю ад супрацоўнікаў хуткай медпадапамогі, якія выехалі па паведамленні аб падзенні дзіцяці з вышыні. Калі я прыбыла на месца здарэння, хлопчык ужо быў дастаўлены ў бальніцу, у кватэры з маці непаўналетняга працавалі следчыя. Толькі пасля таго, як скончылі работу на месцы здарэння праваахоўнікі, можна было агледзець кватэру і сабраць інфармацыю са слоў маці і супрацоўнікаў органаў апекі і аддзела адукацыі, — тлумачыць намеснік старшыні камісіі.

Сям'і хлопчыка цяпер вельмі важна ўвага і падтрымка, дадае спецыяліст.

— Маці яго чакае трэцяе дзіця, асоба бацькі малога ўстаноўлена, ён выплачвае грошы на яго ўтрыманне, і ўсё ж сям'я, дзе выхоўваецца хлопчык, лічыцца няпоўнай, — удакладняе Наталля Кендыш. — У любой сітуацыі пасля надзвычайнага здарэння з непаўналетнім пачынаецца сацыяльнае расследаванне. Вывучаецца інфармацыя аб сям'і, сабраная ўсімі адказнымі службамі.

Вядома, што па законе выпадак траўміравання дзіцяці ў сям'і будзе разгледжаны на пасяджэнні савета прафілактыкі.

— Калі будуць выяўлены крытэрыі сацыяльна небяспечнага становішча сям'і, то савет прафілактыкі вымушаны звяртацца ў абласны каардынацыйны савет аб прызнанні непаўналетніх тымі, хто знаходзіцца ў сацыяльна небяспечным становішчы, — дадала намеснік старшыні камісіі па справах непаўналетніх Светлагорскага райвыканкама.

Службовая асоба звярнула ўвагу, што дакладна адсочваецца сітуацыя з пражываннем другога дзіцяці ў гэтай сям'і.

— Мама чатырохгадовай дзяўчынкі папрасіла пакінуць дачку пад наглядам прабабулі. Супрацоўнікі дзіцячага садка пацвердзілі, што ўмовы пражывання ў жанчыны добрыя, малой добра з родным чалавекам. Але з дарослым абавязкова было агаворана правіла, што дзяўчынка працягне наведваць дзіцячы садок і будзе пад наглядам педагогаў, — канстатуе Наталля Кендыш.

### «Нас вельмі падтрымалі»

Дазнацца, як сям'я перажывае тое, што здарылася, атрымалася ад бабулі маці хлопчыка. Наталля Уладзіміраўна дома, у Светлагорску, — той чалавек, які з нецярпеннем чакае вяртання сваіх дарагіх дзяцей. Яна просіць не ўказваць імёны яе ўнучкі і праўнукаў, якія аказаліся ў цэнтры навін аб надзвычайным здарэнні ў Светлагорску. Бабуля марыць, каб хутчэй усё скончылася і забылася як страшны сон.

— Хлопчык наш — проста космасам пасланы, — не можа стрымаць хвалявання жанчына.

Яна ад усёй іх сям'і перадае нізкі паклон медыкам, што вельмі хутка прыехалі і аказалі дапамогу малому на месцы здарэння.

— Дзякуй вялікі гомельскім урачам, якія хутка адрэагавалі, правялі кансіліум у Светлагорску і перавялі яго ў вобласць. Мы вельмі ўдзячны ўсім медыкам, — дадае Наталля Уладзіміраўна. — Хачу падзякаваць таксама супрацоўнікам дзіцячага садка ў Светлагорску, куды ходзіць мая праўнучка. Яны нас вельмі падтрымалі. Малая наведвае садок і жыве цяпер са мной. Яна вельмі перажывала за брацікa пасля таго, што здарылася. Усё паўтарала: «Ён, выпаў, выпаў, бабуля!». Цяпер дзіця, дзякуй богу, супакоілася, стала спаць спакойна, гуляць.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Валодзін назваў умову, пры якой магчыма аднаўленне збожжавай здзелкі

Спікер Дзярждумы РФ Вячаслаў Валодзін пракаментаваў выхад Расіі са збожжавай здзелкі і назваў умову, пры якой Масква можа вярнуцца да пагаднення. Пра гэта паведамляе агенцтва РІА Навіны.

Расійскі палітык адзначыў, што ўдзел Расіі ў збожжавай здзелцы немагчымы, пакуль Украіна выкарыстоўвае бяспечны калідор для «ўчынення тэрарыстычных атак». Такую заяву ён зрабіў у сувязі з нядаўнім нападзеннем Кіева на Чарнаморскі флот у Севастопалі.

Таксама спікер Дзярждумы Расіі адзначыў, што Масква дала магчымасць Кіеву вывозіць збожжа для краін, якія маюць у гэтым патрэбу. Аднак паводле слоў расійскага палітыка, большая частка збожжа пайшла ў краіны ЕС.

### Пытанне статусу Нагорнага Карабаха прапанавалі пакінуць наступным пакаленням

Пасол Расіі ў Арменіі Сяргей Капыркін прапанаваў пакінуць пытанне вызначэння статусу Нагорнага Карабаха наступным пакаленням. Яго цытуе ТАСС.

Паводле слоў пасла, статус Карабаха будзе вызначаны, калі сфарміруецца ўмова «прымальнага для ўсіх справядлівага вырашэння гэтага пытання».

«Але, зразумела, і аб гэтым гаварыў Прэзідэнт Пуцін на Валдайскім форуме, гэта павінен быць прадукт паміж Арменіяй і Азербайджанам», — дадаў Капыркін.

31 кастрычніка была абнародавана сумесная заява Прэзідэнта Расіі Уладзіміра Пуціна, прэм'ер-міністра Арменіі Нікола Пашыняна і прэзідэнта Азербайджана Ільхама Аліева па Нагорным Карабаху. Лідары падкрэслілі важнасць актыўнай падрыхтоўкі да заключэння мірнага дагавора паміж Ерэванам і Баку.

### Кароль Карл III шукае садоўнікаў для дзвюх сваіх рэзідэнцый



Адразу ў дзвюх рэзідэнцыях караля Вялікабрытаніі Карла III — Букінгемскім палацы і Віндзорскім замку — адкрыліся вакансіі садоўнікаў. Пра гэта паведамляе Daily Mail.

Садоўніку Букінгемскага палаца прапануецца аклад памерам £40 000 у год пры 39-гадзінным працоўным тыдні.

# «ГЭТА НЕ ЧУЖАЯ, ГЭТА НАША БАБУЛЯ...»

## НІЧЫЕ СТАРЫЯ?

А наогул, ідэя не новая — з 1990-х гадоў замяшчальныя сем'і для адзінокіх пажылых людзей і інвалідаў паступова пачалі з'яўляцца ва ўсім свеце. І для нашай краіны яна таксама, што называецца, «ляжала на паверхні». Замяшчальныя сем'і — гэта ж не толькі догляд (тым больш што большасць «усыноўленых» старых яшчэ ў стане пра сябе паклапаціцца). Гэта ў першую чаргу магчымасць зносін. Магчымасць стаць членам сям'і і перастаць вострa адчуваць адзіноту. Герантолагі не стамляюцца паўтараць: сацыяльная ізаляцыя пажылых людзей, з'яўляючыся сумнай прыкметай нашага часу, стварае асяроддзе для развіцця дэменцыі і ў цэлым скарачае працягласць жыцця старых.

— Каб нашы пажылыя людзі заставаліся актыўнымі, каб не сыходзілі ў псіханеўралагічныя дыспансеры ў стане, калі дэменцыя не паддаецца карэкцыі, вельмі важна, каб яны не заставаліся ў адзіноце, — падкрэслівае **галоўны герантолаг Беларусі Людміла ЖЫЛЕВІЧ**.

Яшчэ ў сярэдзіне (і нават у канцы) XX стагоддзя чалавек жыў і старэў у коле сям'і. І гэта правільна, фізіялагічна для чалавека: мы — сацыяльныя істоты, такімі нас задумала прырода.

Калі вы маеце зносіны, уключаецца велізарная колькасць кампанентаў: вы выбіраеце тэму размовы, успрымаеце суразмоўніка, адзначаеце, як ён успрымае вас. Мозг рэагуе на дзясяткі раздражняльнікаў зыходзячы з таго, як развіваецца дыялог.

Сучасны свет, робячы наша існаванне камфортнейшым, спрыяе раз'яднанню людзей — гэта адваротны бок тэхналагічнага прагрэсу. І калі ў маладосці недахопу зносін мы не адчуваем, то ў першую чаргу з адзінотай сутыкнуліся людзі сталага ўзросту. Многія з іх у нашы дні праводзяць «сам-насам» амаль увесь свой час, асабліва калі здарылася так, што блізкіх сваякоў у іх не засталося. Пры гэтым сацыяльная ізаляцыя — ключавы фактар хуткага развіцця сіндрому старэчай астэніі: паталагічнага старэння. Церпіць у першую чаргу псіхічная сфера — адбываецца зніжэнне кагнітыўных функцый, і дэменцыя заяўляе пра сябе «на поўны голас».

Словам, замяшчальная сям'я для пажылога чалавека — гэта і якасць жыцця, і шанц на шчаслівую старасць, якая «ў радасць», у асяроддзі блізкіх людзей. Але што атрымлівае сям'я, якая рашыла стаць замяшчальнай?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ ЗАКОНА

Згодна з Палажэннем аб замяшчальнай сям'і, аказваць такія сацыяльныя паслугі можа дзеяздольны грамадзянін ва ўзросце ад 18 да 65 гадоў, які пастаянна пражывае на тэрыторыі Беларусі. Абодва бакі (і той, хто будзе клапаціцца, і той, пра каго будуць клапаціцца) звяртаюцца з заявай у цэнтр сацабслугоўвання па месцы жыхарства. Канчатковае рашэнне прымае мясцовы выканаўчы камітэт на падставе заключэння створанай з гэтай мэтай камісіі. Дагавор на аказанне такіх паслуг складаецца на тэрмін ад паўгода, але можа быць скасаваны і раней (калі не ўсё пойдзе гладка). Кантроль за ўмовамі пражывання пажылога чалавека ажыццяўляюць супрацоўнікі тэрытарыяльнага цэнтра. У першыя тры месяцы яны наведваюць замяшчальную сям'ю раз у два тыдні, потым — радзей (раз у месяц і затым — раз у квартал).

## БЯСЦЭННЫ ЎНЁСАК

Як ужо гаварылася, узнагароджанне для замяшчальнай сям'і, якая прыняла да сябе пажылога чалавека, не прадугледжана. Вядома, пажылыя людзі ўносяць свой уклад у сямейны бюджэт (па закону, такая сума не павінна перавышаць 75 % пенсіі з улікам надбавак, даплат і павышэнняў). Але гэта не тыя грошы, якія могуць схіліць шалю вагі на карысць рашэння ўзяць у сям'ю староннягa пажылога чалавека. Больш за тое, у шэрагу выпадкаў гэтая сума, цалкам магчыма, нават не пакрые выдаткі на дастойнае ўтрыманне яшчэ аднаго члена сям'і. Калі сям'я клапоціцца пра інваліда І групы, які не можа сам сябе абслугоўваць, прадугледжаны выплаты ў памеры 100 % бюджэту пражытковага мінімуму ў сярэднім на душу насельніцтва. Калі такіх непрацаздольных у замяшчальнай сям'і двое, выплата складзе 150 % бюджэту пражытковага мінімуму. Пажылы чалавек можа выдзеліць жылплошчу замяшчальнай сям'і або пераехаць да іх, але яго квадратныя метры застаюцца яго ўласнасцю. Словам, матэрыяльны інтарэс выключаны.

Што ж кіруе людзьмі, якія прынялі рашэнне прытуліць адзінокую старасць? Фінансавы складнік тут ролі не адыгрывае, падкрэсліваюць супрацоўнікі ТЦСАН Кіраўскага раёна. Тут вядучая роля — у эмацыянальнай сферы. Іншымі словамі, замяшчальная сям'я — гэта не пра выгаду. Гэта пра пачуцці: пра чалавечае цяпло і дабрыню.

Дарэчы, колькасць замяшчальных сем'яў на Магілёўшчыне паступова павялічваецца. У 2021 годзе іх было каля трох дзясяткаў, цяпер іх колькасць паступова набліжаецца да 50. У невялікім Кіраўскім раёне на сённяшні дзень замяшчальных сем'яў для старых — тры.

— Гэтая форма работы вельмі дабратворна ўплывае на нашых адзінокіх пажылых людзей — хоць адзінокімі іх цяпер і не назавеш, — расказвае **намеснік дырэктара Кіраўскага раённага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Таццяна ДАШКЕВІЧ**. — Зразумела, з боку сацыяльнай службы існуе кантроль: як ставяцца да пажылых у «прыёмнай сям'і». І, як правіла, распавядаючы аб сваім новым жыцці, старыя ўсміхаюцца, іх настрой — пазітыўны, яны адчуваюць сябе абароненымі і любімымі.

Хто ж тыя людзі, якія згаджаюцца клапаціцца пра «чужую» старасць?

— Перш за ўсё, людзі, якія не лічаць, напрыклад, пажылых суседзяў «староннімі», — кажа Таццяна Іванаўна. — Менавіта таму больш замяшчальных сем'яў — у сельскай мясцовасці: мегаполісам гэтая грань ментальнасці ўласцівая ў меншай меры.



Трэба сказаць, што пяць гадоў таму ўпершыню падобная сацыяльная мадэль была апрабаваная ў Вілейскім раёне, і сёння ён сярод лідараў па колькасці замяшчальных сем'яў для старых. У Магілёўскай вобласці ў складзе лідараў — Кіраўскі раён.

Вельмі часта сям'я «ўсынаўляе» пажылога чалавека, які калісьці быў блізкі да бацькоў, што пакінулі гэты свет, які дапамагаў і падтрымліваў у дзяцінстве або юнацтве — так яны аддаюць доўг падзякі, распавядаюць спецыялісты сацыяльнага цэнтра. Акрамя таго, пажылыя людзі могуць даць сям'і вельмі многае: гэта не вымяраецца ў грашовых адзінках, але часам каштоўнейшае за грошы, падкрэсліваюць яны.



Старых «усынаўляюць» часцей людзі даволі сталага ўзросту — бліжэй да пажылога.

Больш за палову замяшчальных — сем'і з дзецьмі. То-бок сем'і, якім патрэбныя... бабулі і дзядулі. Тыя, хто заўсёды пасядзіць з дзіцем, выслухае і зразумее, хто будзе песціць унукаў і ў любой сітуацыі станавіцца на іх бок. Пагадзіцеся, калі вы ніколі не хадзілі з дзедам на рыбалку і не давяралі бабулі свае дзіцячыя перажыванні, ваша маленства было... няпоўным, ці што. Бабуля і дзядуля — найважнейшыя людзі ў жыцці любога дзіцяці, і нават калі ўнук або ўнучка становяцца дарослымі, яны застаюцца для бабулі і дзядулі аб'ектам невычэрпнай любові і клопату. Толькі бабуля і дзядуля прымуць унука або ўнучку цалкам і безумоўна, з усімі капрызамі, дзіцячым эгаізмам або падлеткавым крызісам, будуць абараняць нават перад бацькамі і апраўдаюць у душы, нават калі ў нейкай сітуацыі «ўнучак» відавочна не мае рацыю... І калі здарылася так, што лёс абдзяліў вас старэйшым пакаленнем сям'і — менавіта «прыёмныя» пенсіянеры змогуць, у сваю чаргу, запоўніць тую пустату і зрабіць сям'ю больш шчаслівай, кажуць супрацоўнікі Цэнтра сацыяльнай абароны насельніцтва Кіраўскага раёна.

Яшчэ адзін тып сем'яў, якія часцей за ўсё вырашаюцца стаць замяшчальнымі для адзінокіх пажылых людзей, — пары сталага ўзросту без дзяцей. Людзі хочуць падзяліцца любоўю і клопатам з тымі, каму яны асабліва патрэбныя. На самай справе, ім магчымасць адарыць кагосьці сваім цяплом патрэбная не менш, чым атрымаць яго — тым, хто ў гэтым мае патрэбу...

## ПРА АСАБІСТЫ ПРЫКЛАД

Калі сям'я Манкеевых з аграгарадка Стайкі Кіраўскага раёна вырашыла стаць замяшчальнай для 91-гадовай Марыі Савелеўны Паладзенкі, некаторыя сталі пытацца Алу: маўляў, навошта табе тое?

— У мяне часам цікавяцца: «Навошта вы гэта робіце?» — распавядае жанчына. — Але Марыя Савелеўна нам як родная, мы заўсёды тут жылі разам. Яна не чужая, яна наша бабуля. Ды і мае дзеці і ўнукі яе любяць.

Ала была сяброўкай сваячкі Марыі Савелеўны, якая клапацілася пра яе. І калі дагледзець бабулю не было каму, Ала вырашыла ўзяць яе ў сваю сям'ю.

— Мая сяброўка часта ляжала ў бальніцы, і я прыглядала за яе цёткай. І калі паўстала пытанне, дзе будзе жыць адзінокі пажылы чалавек, бабуля сама сказала: «Пайду да радні». Гэта яна пра маю сям'ю так сказала: прывыкла да нас, лічыла роднымі, — распавядае Ала.

Суразмоўніца кажа: муж падтрымаў яе рашэнне, і ў цэлым у яе вялікай сям'і — трое дзяцей, чацвёра ўнукаў — усе ўхвалілі з'яўленне яшчэ аднаго чалавека. І вось ужо тры гады сям'я клапоціцца аб «сваёй бабулі».

— Маіх бацькоў ужо няма на свеце, і для мяне і маіх дзяцей Марыя Савелеўна стала роднай. Маленькія ўнукі лічаць яе сваёй прабабуляй.

«Яна добрая, не капрызная, цярплівая», — усміхаецца Ала. Кажа, Марыя Савелеўна, нягледзячы на сталы ўзрост, здольная сама сябе абслугоўваць: і адзяваецца-мыецца, і есць таксама сама, з лыжачкі карміць яе не трэба. Часам спявае сваёй «дачцэ» народныя песні — Ала любіць яе спевы слухаць.

— Пытаюся: ці баліць што-небудзь? Адказвае: усё ў парадку, што ж ты хочаш — мне ж хутка сто гадоў! — кажа жанчына.

Ала перакананая, што гэты ўчынак стане добрым прыкладам для малодшага пакалення сям'і, бо дзяцей дарослым трэба выхоўваць не словамі, а справамі. І значыць, у сталыя гады ніхто са старэйшага пакалення сям'і Манкеевых не застанецца сам-насам са старасцю і хваробамі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

---

Надрукавана ў «Полымі»: кастрычнік, 2022

# ВОСЕНЬСКІЯ НАСТРОІ Ў ПАЭЗІІ І ПРОЗЕ




**Кастрычніцкі нумар «Полымя» па традыцыі багаты на празаічныя і паэтычныя публікацыі. Адкрываецца часопіс падборкай вершаў Хведара Гурыновіча «Восеньскае». *«Змоўклі конікі ў лузе. / Блізка верасень босы. / Стог, адзіны ў акрузе, / Падпірае нябёсы. / Стог — адзін на пасёлак, / Бо адна ж і кароўка. / Сум паўзе па прасёлку, / Доўгі, быццам вяроўка...»* Традыцыі народнага жыцця, чалавек вясковы ў часе і прасторы, сузіранне навакольнай прыроды — вось лейтматыў вершаў Хведара Гурыновіча.**

Заканчваецца ў кастрычніцкім нумары раман Людмілы Рублеўскай «Авантуры Пранціша Вырвіча, маршалка Менскага». Гэта — сёмы твор са знакамітага цыкла пісьменніцы. Ужо вядома, што раман убачыць свет і асобнай кнігай — у Выдавецкім доме «Звязда».

З паэтычнымі падборкамі ў часопісе выступаюць Іна Фралова («Экалогія душы»), Ніна Загарская («Акварэлі часу»), Генрых Тарасевіч («Мілей за ўсё») — аўтары, якія добра знаёмыя не толькі чытачам часопіса «Полымя».

Не абмініце апавяданні Святланы Бязлепкінай — «Таямніцы гатэля «ROYAL», Алеся Каждубa «Фацбалісты, ша!», празаічныя мініяцюры Адама Глобуса «Аўтапартрэт з усмешкай. Словы пра самога сябе». Варта заўважыць, што празаічны аддзел часопіса «Полымя» ад нумара да нумара становіцца ўсё мацнейшым. І хто даўно не разгортваў старонкі часопіса — знайдзіце яго ў бібліятэцы і таксама пераканайцеся ў гэтым.

У раздзеле «Навуковыя публікацыі» — «Семантыка і функцыі канцэптаў свой, чужы, свой — чужы, дом, страчаны прытулак у творах А. Адамовіча «Нямко» і Г. Бёля «Дом без гаспадара» Антона Папова і «Развіццё музычных вобразаў як прыём меладызацыі ў паэзіі Яўгеніі Янішчыц і Раісы Бараўковай» Вікторыі Смолкі.

Рубрыка «Да 100-годдзя часопіса «Полымя» працягвае прадстаўляць успаміны колішняга «палымянца» Генадзя Пашкова «Круціла жорны завіруха, або Ля цяпельца «Полымя». Праўдзівыя гісторыі ад іх удзельніка і сведкі». Са сваім успамінам пра «Полымя» і «палымянцаў» выступае Яўген Хвалей — «З доўгім поступам». У нумары знайшлося месца і рэцэнзіям на кніжныя навінкі, а ў раздзеле «Братэрства» — артыкул знанага даследчыка сербскай літаратуры, сербска-беларускіх літаратурных сувязяў, перакладчыка, доктара філалагічных навук Івана Чароты «Пра сваё па-сваяцку — сербам».

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

# ЗЯМЛЯ ГЕРОЯЎ І МЕСЦА ПОДЗВІГУ



Большасць нумароў падпольных газет у гады Вялікай Айчыннай вайны была надрукавана на востраве Зыслаў.

## ЖОРСТКАЯ НЕАБХОДНАСЦЬ

Першыя нумары падпольных выданняў у партызанскай зоне выйшлі ў вёсцы Шостая брыгада (цяпер Дварэц). Рэдакцыя размяшчалася ў звычайнай вясковай хаце, дзе гаспадарыла Марфа Мігун. Аб гістарычным факце сведчыць мемарыяльная шыльда, якую ўрачыста адкрылі тут у маі 1975 года. Праўда, на месцы хаты, дзе некаторы час размяшчалася падпольная тыпаграфія, цяпер стаіць новая. Аднак памяць аб тым, што адбывалася тут у найбольш складаны перыяд у нашай гісторыі, захоўваецца дагэтуль — няхай і іншымі гаспадарамі, няхай і новымі жыхарамі Дварца.

Над выпускам «Звязды» і «Чырвонай змены» ў зоне партызанскіх злучэнняў працавала ўсяго некалькі чалавек: былы рэдактар Любанскай раённай газеты Піліп Касцюкавец, карэспандэнт даваеннай «Советской Белоруссии» Георгій Шчарбатаў, супрацоўнікі Капаткевіцкай раённай газеты Амяльян Шурпач, Аляксандр Сакевіч, Мікалай Курыка і Ніна Цыцько. Узначальваў абагульненую рэдакцыю дзвюх газет даваенны рэдактар «Чырвонай змены» Міхаіл Барашкаў.

Калі ў хаце Марфы Мігун размяшчалася друкарня, то ў суседняй, дзе гаспадарыла Марыя Бубіч, журналісты-падпольшчыкі жылі. Як успамінаў адзін з супрацоўнікаў рэдакцыі Амяльян Шурпач, які да самай пенсіі працаваў у «Звяздзе», умовы работы і быту былі суровыя. «Мы не мелі права нікуды, акрамя нашых кватэр, адлучацца, нікому нічога гаварыць пра свой занятак, — расказваў ён. — Нам, вядома, не падабалася ўсё гэта. Пасля шматлікіх паходаў, небяспечных аперацый апынуцца ледзь не пад арыштам — прыемнасці мала. Хутка мы пераканаліся, што суровыя ўмовы канспірацыі — не выдумка, а жорсткая неабходнасць».






## АДНО ЖАДАННЕ — ХУТЧЭЙ ВЫЗВАЛІЦЬ РАДЗІМУ

Ствараць газеты ў тыле ворага — надзвычай рызыкоўная справа: у любы момант журналісты маглі трапіць у рукі да гітлераўцаў. Няпроста было друкаваць газеты і з тэхнічнага пункту гледжання: памяшканне не падыходзіла для выдавецкай дзейнасці, ды яшчэ ўвесь час нечага не хапала: то

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)



Герой Сацыялістычнай Працы Кузьма Іванавіч Шаплыка.

друкарскай фарбы, то паперы (бывала, што ў ход ішлі нават вучнёўскія сшыткі). Яшчэ больш складана было знаходзіць патрэбныя словы, каб не горш чым зброяй біць імі ворага. У журналістаў гэта выдатна атрымлівалася, аб чым сведчыць той факт, што чарговы выпуск «Звязды» або «Чырвонай змены» прыводзіў гітлераўцаў у шаленства — нацысты прыкладалі шмат намаганняў, каб знайсці падпольную рэдакцыю.

«Партызаны і партызанкі! — пісала ў адным з ваенных выпускаў «Звязда». — Мініруйце ўсе шляхі адходу нямецкіх войскаў. Пад адхон нямецкія эшалоны! У паветра аўтамашыны, танкі і гарматы праціўніка. Ірвіце сувязь і чыгуначнае палатно, нападайце на тылы, высочвайце і знішчайце штабы і склады гаручага і боепрыпасаў. Агнём і куляй сустракайце нямецкіх фашыстаў заўсёды і ўсюды!»

Пра подзвігі моладзі рэгулярна на сваіх старонках распавядала «Чырвоная змена». Наколькі яна была баявой, можна меркаваць па наступных радках: «Маладыя патрыёты! Не ідзіце з немцамі ні на якія згоды. Трымайцеся, каб вораг не пахіснуў вашай упэўненасці ў нашу перамогу, каб не завалодаў вамі. Усе на бой з гітлераўцамі за вызваленне сваёй Радзімы ад нямецкай тыраніі!» Пераканаўча ў маладзёжным выданні гучыць і паведамленне памочніка камісара па камсамолу энскай партызанскай брыгады Уладзіміра Ш.: «Моладзь і камсамольцы гараць адным жаданнем — хутчэй вызваліць сваю Радзіму ад нямецкай няволі. Зварот воінаў-беларусаў да партызанаў і партызанак, да ўсяго беларускага народа, поспех Чырвонай Арміі ўзнялі новую хвалю баявой актыўнасці». Журналісты-падпольшчыкі рэгулярна атрымлівалі перамогі на інфармацыйным полі бою.

У партызанскім краі «Звязда» выходзіла два разы на тыдзень — па суботах і серадах, «Чырвоная змена» — па нядзелях. Часцейшая перыядычнасць была проста не па сілах невялікаму рэдакцыйнаму калектыву. Мала было толькі напісаць публікацыю і змясціць яе ў газету: дзякуючы сучасным сродкам яно робіцца вельмі хутка, раней жа гэта быў вельмі працаёмкі працэс. Нягледзячы на тое, што самі партызаны, адказныя падпольныя партыйныя і камсамольскія работнікі прыносілі ў рэдакцыю матэрыял, журналісты рэгулярна знаходзіліся «ў камандзіроўках». Здабываючы актуальную інфармацыю з месца падзей, яны разам з народнымі мсціўцамі ўдзельнічалі ў аперацыях па разгроме варожых гарнізонаў, у дыверсіях на чыгунцы і дарогах — а значыць, увесь час знаходзіліся пад куляй. Нярэдка, калі вораг быў зусім побач, замест алоўкаў і вярстатак у рукі даводзілася браць аўтаматы.

## ПРАЎДЗІВА І ТРАПНА

У партызанскай зоне калектыву «Чырвонай змены» і «Звязды» часта прыходзілася змяняць месца дыслакацыі — такія абставіны ваеннага часу. У цяперашнім Дварцы выйшла па некалькі выпускаў газет. Ствараліся выданні і ў іншых населеных пунктах. Асноўнай жа «прапіскай» у партызанскім краі для найстарэйшых газет Беларусі стаў легендарны востраў Зыслаў. Менавіта тут у гады акупацыі размяшчаліся Мінскія падпольныя абкамы КП(б)Б і ЛКСМБ, Любанскі падпольны РК КП(б)Б, штабы некаторых партызанскіх злучэнняў, партызанскі аэрадром, а таксама рэдакцыя любанскай раённай газеты «Кліч Радзімы».

На Любаншчыне «Звязда» ўбачыла свет 98 разоў (усяго ў партызанскай зоне было выпушчана 105 нумароў газеты). У тыле ворага выйшла 48 выпускаў «Чырвонай змены». Уклад гэтых дзвюх газет у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі вельмі істотны. Журналісцкае слова праўдзіва расказвала аб падзеях на фронце, выкрывала сапраўдныя намеры акупантаў, заклікала папаўняць шэрагі народных мсціўцаў. Насельніцтва з нецярпеннем чакала чарговыя выпускі газет, чытала кожную змешчаную публікацыю і, вядома, добра разумела, што кожны радок быў напісаны ў неверагодна складаных умовах, з рызыкай для жыцця.

У сакавіку 1944 года маладзёжная газета адасобілася ад «Звязды» і пачала выдавацца ў вызваленым Гомелі, дзе яе ўзначаліў і рэдагаваў Іван Матыль. Пасля вызвалення сталіцы выданне беларускай моладзі вярнулася ў Мінск. У ліпені 1944 года аднавіла тут сваю дзейнасць і «Звязда». Займеўшы асобныя рэдакцыі, уласныя штаты творчых супрацоўнікаў, маючы сваю перыядычнасць і тэматычную скіраванасць, дзве рэспубліканскія газеты заўсёды крочылі побач. Грунтуючыся на гераічным мінулым, яны, як дзве сястры, дапаўнялі адна адну ў айчынным медыяполі. Невыпадкова, калі ў красавіку 2002 года «Чырвоная змена» спыніла выхад як самастойнае выданне, яе далучылі да «Звязды», дзе газета выходзіць у якасці дадатку пад назвай «Чырвонка. Чырвоная змена». Два перыядычныя выданні ствараюцца ў адной рэдакцыі.

## СЛАВА ШАПЛЫКІ

Подзвіг супрацоўнікаў дзвюх газет увекавечаны не толькі ў Мінску («Звяздзе» тут пастаўлена некалькі помнікаў), а і таксама на Любаншчыне: і на Зыславе, і ў канкрэтных населеных пунктах, дзе хоць і часова, але знаходзілася падпольная рэдакцыя (у тым ліку ў цяперашнім Салігорскім, Слуцкім раёнах). Калі ж імя газеты «Звязда» носіць адзін з праспектаў сталіцы, то ў гонар «Чырвонай змены» ў Любанскім раёне яшчэ да вайны быў названы цэлы калгас.

Дарэчы, Любаншчына ўвайшла ў гісторыю Беларусі не толькі як партызанскі край. Гэтая зямля, якая натхняла самога Янку Купалу (менавіта тут класік напісаў знакамітую паэму «Над ракой Арэсай») і іншых знакамітых пісьменнікаў, дала краіне трох Герояў Савецкага Саюза, а таксама 18 Герояў Сацыялістычнай Працы. Сярод іх — Кузьма Іванавіч Шаплыка, імем якога быў названы калгас «Чырвоная змена».

Усё, як той казаў, па заслугах. 51 год Кузьма Іванавіч кіраваў гаспадаркай, якая стала адной з перадавых ва ўсёй Беларусі. Ці думаў пра гэта колішні партызан-разведчык, які пасля вызвалення вярнуўся ў родныя мясціны, на Любаншчыну, і праз год узначаліў калгас? Як адданы Радзіме баец (аб гэтым сведчыць яго ўзнагароды: ордэн Чырвонай Зоркі, медалі «За адвагу», «За баявыя заслугі»), ён прасіўся на фронт. Не адпусцілі. Арганізатарскія здольнасці Шаплыкі былі неабходныя для аднаўлення разбуранай вайной народнай гаспадаркі. І Кузьма Іванавіч з усёй адказнасцю, якая была ўласцівая яго характару, узяўся за даручаную справу. Неўзабаве слава аб Шаплыку грымела на ўсю краіну, за яго эксперыментатарскімі рашэннямі сачылі і па тэлебачанні, і ў прэсе. У гасцях у легендарнага старшыні калгаса бываў і сам Машэраў.

Нягледзячы на такую ўвагу з боку найвышэйшага кіраўніцтва краіны і вялікую колькасць ганаровых званняў (Герой Сацыялістычнай Працы, кавалер трох ордэнаў Леніна, трох ордэнаў Працоўнага Чырвонага Сцяга, «Знака Пашаны», заслужаны работнік сельскай гаспадаркі Беларусі, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР і іншае), ён заўсёды быў сціплым чалавекам, які, не шкадуючы сябе, імкнуўся як мага больш зрабіць добрых спраў, дапамагчы людзям. Пры Кузьме Іванавічы цэнтр гаспадаркі — вёска Сарачы — стала прыгожым, сучасным пасёлкам. На вясковых вуліцах з'явіліся шматпавярховыя жылыя дамы, былі пабудаваны адміністрацыйны будынак, гасцініца, гандлёвы цэнтр, дзіцячы садок, школа, кафэ-рэстаран, Дом быту, Палац культуры. У 1971 годзе разам з атрыманнем высокай узнагароды — ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга — гаспадарка стала адной з найбольш паспяховых у Беларусі.

11 красавіка 1997 года Кузьма Шаплыка пайшоў з жыцця. Аднак галоўнае яго тварэнне — калгас «Чырвоная змена» — жыве дагэтуль. Называецца, праўда, па-сучаснаму — адкрытае акцыянернае таварыства — і носіць імя чалавека, які не толькі праславіў гэты невялічкі куточак Любаншчыны на ўсю краіну, а і зрабіў жыццё яго жыхароў больш камфортным і прыстойным. Удзячныя нашчадкі ў гонар Кузьмы Шаплыкі назвалі не толькі гаспадарку. Імя Героя Сацыялістычнай Працы ў аграгарадку Сарачы носіць вуліца, у Любані ў гонар сапраўднага беларуса ўстаноўлены помнік і памятны знак. Беларусы памятаюць сваіх герояў — і тых, хто змагаўся з ворагам на франтах і ў акупацыі, і тых, хто праслаўляў сваю Айчыну ўжо на мірных палетках.

**Вераніка КАНЮТА.**
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

На сваёй зямлі

# «У КОЖНЫМ МЕСЦЫ ЁСЦЬ ДА ЧАГО ПРЫКЛАСЦІ РУКІ...

## ёсць дзе праявіць фантазію і ўмельства»



**ГАЗЕТА «Звязда» досыць часта друкуе артыкулы аб тым, як жыхары вёсак, мястэчкаў, гарадоў наводзяць парадак на сваіх вуліцах, у дварах, як па месцы жыхарства ладзяць розныя святы. Вось такое з нагоды юбілею адбылося і ў нас, а напярэдадні...**

Да юбілею Гайны (а ёй сёлета шэсцьсот дзевяцьсот дзевяцьсот... ды яшчэ і дваццаць пяць!) мы пачалі рыхтавацца загадзя. У сацыяльных сетках я змясціла зварот да ўсіх неабыякавых, папрасіла выказаць свае прапановы па падрыхтоўцы і святкаванні гэтай прыгожай даты. Першай адгукнулася мая былая вучаніца Таццяна Матусевіч. Яна звязалася са сваімі аднакласнікамі, з аднавяскоўцамі, якія жывуць у іншых месцах, і працэс, што называецца, пайшоў: прычыніца да справы абяцалі многія...

Пра свае намеры навесці парадак у парку, на крынічцы і на ўчастку рэчкі паміж дзвюма дарогамі, а таксама выдаць кнігу аб шасці стагоддзях мястэчка мы расказалі на прыёме ў старшыні райсавета. Тады ж прапанавалі дату святкавання: сярэдзіна жніўня, каталіцкае Успенне Багародзіцы, на якое ў Гайне цягам стагоддзяў праходзілі вялікія кірмашы.

Пасля гэтага наступаў час дзейнічаць, і я, забягаючы наперад, скажу: мы зрабілі ўсё, што планавалі. У Гайне з'явілася некалькі цудоўных месцаў, якія радуюць сваёй прыгажосцю, служаць візітоўкамі для нашых гасцей. Прычым зроблена ўсё талакой, клопатам гайненцаў і іх нашчадкаў, асобных дачнікаў і нават тых, хто ніколі не жыў тут, а проста зразумеў наш клопат. (Зазначу, што нямала было і тых, хто называў нас дзівакамі, а то і адкрыта смяяўся.)

Прывяду хіба некалькі лічбаў: амаль 70 чалавек сваім рублём, што называецца, падтрымалі выданне кнігі, 40 — ахвяравалі сродкі на набыццё матэрыялаў, неабходных для вырабу лавак, ветрака, для аздаблення крыніцы. Асаблівыя словы ўдзячнасці Міхаілу Пашэвічу, які набыў другое кальцо для крыніцы, дапамог з плітамі для ўмацавання яе берагоў, утрох, разам з сынам і пляменнікам, мужчыны ачысцілі ход крынічнай вадзе.

Калі наогул, то проста дзіву даешся, як можна было столькі зрабіць сіламі жменькі людзей, за тры месяцы, уручную, без капейкі дзяржаўных грошай! Парк, а дакладней сквер у цэнтры вёскі, ачышчаны ад смецця, па ім развезены два вялікія прычэпы завознай зямлі. Па перыметры і на клумбах высаджаны кветкі і кусты.

Віктар Матусевіч, нягледзячы на праблемы са здароўем, зрабіў для сквера адмысловыя лаўкі. Разам з сынамі і Сяргеем Кудрэвічам мужчыны змайстравалі дах для крынічкі, лесвічку (з узорнымі парэнчамі!) для спуску да вады, дэкаратыўны млын... Да іх каманды ўдала далучыўся Андрэй Вашчышын, здатны на розныя цікавыя прыдумкі.



Аднак і зноў жа ўсё аздабленне было зроблена пасля таго, як рукамі 10—12 чалавек абапал крыніцы высеклі сухія дрэвы, вывезлі залежы смецця, ачысцілі берагі, вынішчылі баршчэўнік.

А найболей у памяці сакавіцкія нядзельнікі па ачыстцы рэчкі, на якія выходзіла па 20 і больш чалавек. Асноўную работу — з бензапілой — браў на сябе Іван Кавалеўскі, усе астатнія — хто ачышчаў берагі, хто даставаў з вады рознае смецце, абломкі дрэў... Потым мы ўручную ўклалі два МАЗы шчэбеню на топкі ўчастак дарогі, на подступы да крыніцы, абкасілі берагі і дарогу, паставілі лаўкі.

...Да 1 ліпеня ўсё запланаванае было зроблена, кніга «Шэсць стагоддзяў Гайны» з дапамогай Іны Шэшко выйшла. Усе, хто прымаў удзел у добраўпарадкаванні нашых аб'ектаў, 2 ліпеня, у дзень вызвалення мястэчка ад фашысцкіх захопнікаў, сабраліся на свята падвядзення вынікаў. Да яго была падрыхтавана цэлая праграма з экскурсам у гісторыю вёскі, з узнагароджаннем, з аўтарскімі песнямі пра Гайну, з прыпеўкамі пра нашу працу і нават з гімнам.

Вельмі кранальнай атрымалася частка праграмы, прысвечаная вайне. Яе мы не рыхтавалі загадзя: проста ўсе расказвалі пра сваіх родных, пра гады акупацыі, спявалі песні.

Назаўтра, 3 ліпеня, мы ўсклалі кветкі да помніка землякам, на плітах якога 186 прозвішчаў загінулых.

А 13 жніўня на плошчы, дзе некалі праходзілі кірмашы, адбылося свята з вялікім канцэртам, атракцыёнамі, гандлёвымі палаткамі, салдацкай кашай, экскурсіяй на мясцовую аграсядзібу, асвячэннем крынічкі. Раённыя ўлады падарылі аграгарадку абсталяванне для дзіцячай пляцоўкі.

...У газетах досыць часта пішуць пра людзей залатога ўзросту, пра тое, як зрабіць іх жыццё цікавым. Дам параду: бярыце прыклад з нас! У кожным месцы ёсць да чаго прыкласці рукі, ёсць дзе праявіць сваю фантазію і ўмельства.

**Тамара Кохан,**
*м. Гайна, Лагойскі раён.*

Ганарымся!

# КРЫНІЦА ВЕДАЎ І НАТХНЕННЯ

**Нашай школе 85! Яна — першая сярэдняя ў Мар'інай Горцы. Яна — першая і цяпер адзіная гарадская беларускамоўная. І зноў жа першая, дзе з'явіліся групы дзіцячага садка і дзе створаны ўмовы для навучання і выхавання дзяцей з асаблівасцямі развіцця. Іншымі словамі — гэта сапраўдны адукацыйны комплекс.**

Некалі, у 1937-м, школа размяшчалася ў двухпавярховым цагляным будынку і мела 10 вучэбных класаў. Матэрыяльна-тэхнічная база была вельмі сціплай, падручнікі — на дваіх, а то і на траіх вучняў... І пры гэтым працавалі гурткі мастацкай самадзейнасці, рыхтаваліся святочныя прадстаўленні, дэманстраваліся фільмы... Нашы вучні марылі стаць ваеннымі, лётчыкамі, настаўнікамі, інжынерамі, аграномамі, але... усё перакрэсліла вайна

У гады Вялікай Айчыннай на тэрыторыі Мар'інай Горкі дзейнічала падпольная партыйна-камсамольская група. Наш выпускнік Уладзімір Мацкевіч быў там радыстам, тройчы паранены ён кожны раз вяртаўся ў строй, каб працягваць барацьбу і ўрэшце прыняць удзел у знакамітым парадзе Перамогі...

Многія іншыя выпускнікі, настаўнікі, вучні да яе, на жаль, не дажылі: на франтах і ў партызанах загінулі завуч школы Іван Размысловіч, настаўнікі Рыгор Шкляр, Аляксандр і Лідзія Нічыпаровічы, выпускнікі Яўген Васілеўскі (навучэнец Таганрогскага авіяцыйнага вучылішча), Доніл Ідэльчык (студэнт Ленінградскага ўніверсітэта), вучаніца Вольга Бамбурава...

У будынку школы ў час вайны знаходзілася нямецкія казармы, ад якіх пасля адступлення засталіся толькі сцены.

Нягледзячы на гэта, адразу пасля вызвалення краіны дзеці зноў селі за парты (хто — у разбураным будынку, хто — у памяшканнях рэдакцыі райгазеты і аптэкі). Вучыліся ў тры змены, без падручнікаў. Матэрыял засвойвалі па цудам захаваных канспектах настаўнікаў. Сярод іх былі Веньямін Ізраелевіч Мышалаў, Аляксандр Васільевіч Крывашчук, Юрый Навумавіч Борд, былыя франтавікі Мікалай Аляксеевіч Цялішчаў, Барыс Мікалаевіч Прасвірын, Аляксей Аляксандравіч Хрулёў, Андрэй Міхайлавіч Юркевіч... Школа, нягледзячы на цяжкасці, змагла наладзіць паўнавартасны адукацыйны працэс. У 1960-м, дзякуючы агульным намаганням, у нас з'явіліся спартыўная зала і пляцоўка на вуліцы, дзе першыя крокі да вялікіх перамог зрабіў удзельнік Алімпійскіх гульняў, дзевяцікратны рэкардсмен краіны ў хадзьбе на 20 км Артур Меляшкевіч.

У гэты ж час з'явіліся вытворчыя майстэрні і доследнае поле, дзе вырошчвалі яблыні, грушы, вішні, школа стала пераходзіць на кабінетную сістэму навучання. Імёны тагачасных дырэктараў Івана Барысавіча Дубінкі, Івана Васільевіча Макухіна, Аляксандра Епіфанавіча Карабцова, Віктара Сцяпанавіча Тарашкевіча, Абрама Маркавіча Гелера, Дзмітрыя Мікалаевіча Стасевіча, Тамары Ільінічны Іваніцкай упісаны ў гісторыю, у лёсы людзей, вялікімі, а то і залатымі літарамі.

...Са з'яўленнем у горадзе новых школ у нашай зменшылася колькасць навучэнцаў, мяняўся статус, назва і нават адрас. У новым будынку 35 вучэбных кабінетаў, сталярная і слясарная майстэрні, актавая і дзве спартыўныя залы, сталовая, сучасны медпункт... Школа ўпэўнена крочыць наперад: 25 нашых настаўнікаў і выхавальнікаў маюць вышэйшую катэгорыю, 8 педагогаў (чым не падстава для гонару?) — нашы выпускнікі. Яны ж, былыя вучні, прыводзяць да нас сваіх дзяцей.

...Як і ў кожнай установе адукацыі, у нас ёсць дасягненні ў самых розных конкурсах, прадметных алімпіядах, даследчай дзейнасці, мастацкай самадзейнасці, спартыўных спаборніцтвах...

Але ж ёсць і тое, што робіць нас адметнымі. У гэтым навучальным годзе адчыніліся дзверы трох груп дзіцячага садка, створаны класы і для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця. Адзін з пасылаў, які імкнёмся данесці да навучэнцаў, — мы ўсе розныя, але павінны стаць адной вялікай сям'ёй, у якой з радасцю дапамагчы іншаму. У нас створана безбар'ернае асяроддзе, працуе бацькоўскі клуб «Мы разам», профільны лагер «Вытокі». Дзясяткі нашых юнакоў і дзяўчат сталі выпускнікамі профільных класаў педагагічнага і спартыўнага напрамкаў, паспяхова працуюць авіямадэльны і ракетамадэльны гурткі. Кіраўнік іх Уладзімір Пасюкоў упэўнены, што сучасным дзецям цікавы не толькі камп'ютарныя гульні, але і тэхнічнае канструяванне. У школе ёсць асобнае памяшканне для вывучэння тэорыі авія- і ракетабудавання, вучні працуюць з чарцяжамі, ствараюць уласныя мадэлі і вяртаюцца чэмпіёнамі альбо прызёрамі міжнародных (!) спаборніцтваў.

А ўсё таму, што ў калектыве працуюць сапраўдныя педагогі, здольныя разгледзець таленты, убачыць, хто з вучняў можа стаць доктарам, настаўнікам, прадпрымальнікам, аграномам, зрабіць усё, каб выпускнікі змаглі адбыцца ў жыцці, у сваіх прафесіях. Школа ўсе свае 85 гадоў працавала і працуе дзеля вучняў, і яны не падводзяць: знаходзяць сваё месца ў жыцці, вытокі якога пачыналіся з крыніцы ведаў.

**Вадзім Кушняроў,**
**дырэктар Мар'інагорскага вучэбна-педагагічнага комплекса дзіцячы сад — сярэдняя школа.**

Чалавек — чалавеку

# З настальгіяй па сапраўдным

**Сёння ўжо мала хто піша ручкай. Навошта, калі пад рукой клавіятура: націскай клавішы, чытай, выдаляй...**

Я вучыўся пісьму яшчэ ручкай з пяром. Пры гэтым трэба было прызвычаіцца да чарніліцы (шкляной альбо белай, керамічнай, з абадком...), каб не набраць на пяро лішняй вадкасці, каб не нарабіць кляксаў... Што, на жаль, не вельмі ўдавалася, асабліва дома, калі хацелася хутчэй зрабіць «дамашку» і лішнюю гадзіну пагуляць...

Потым надышоў век шарыкавых ручак. У маім стале іх цэлая калекцыя. Вось урачыста-чырвоная з надпісам «Звязда». Выдавецкі дом». Гэта — прыемны напамін аб перамозе ў конкурсе на найлепшую вясёлую і праўдзівую гісторыю. А вось вытанчана-беленькая з выявай першага нацыянальнага канала беларускага радыё, якая прыйшла да мяне, калі стаў фіналістам літаратурнага конкурсу «Бацькаўшчына светлая мая».

Ёсць яшчэ ручка-падарунак ад «Беларускай лясной газеты» за супрацоўніцтва. Яна — з зялёненькімі рыскамі, якія сімвалізуюць елачку... Чырвоная ручка з санаторыя «Парэчча» — за ўдзел у канцэрце, за верш... І яшчэ шэраг ручак, купленых, прывезеных, падараваных...

А вось маёй першай ручкі — той, з пяром — на жаль, няма, хоць мець хацелася б. Яшчэ і таму, што ў чацвёртым класе падпісваў ёю віншаванне адной сімпатычнай дзяўчынцы, што ў дзясятым...

Ручка, асадка, пісьмовыя зносіны выхоўвалі нас зусім не горш, чым сённяшні інтэрнэт. Ці не так?

**Аляксандр Матошка,**
*Расонскі раён.*

# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

2 лістапада 2022 г. № 42 (678)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ


ТЭМА ТЫДНЯ

# ПАЛІТЫЧНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВАЧЫМА ГРАМАДЗЯН



Фота БелТА і Лізаветы ГОЛАД.







*Дыялогавыя пляцоўкі праходзяць па ўсёй краіне.*

**СЁННЯ заканчваецца абмеркаванне законапраекта «Аб Усебеларускім народным сходзе», у якім на шматлікіх дыялогавых пляцоўках брала ўдзел без перабольшання ўся краіна. Падчас усенароднага абмеркавання важных і для дзяржавы, і для грамадства законапраектаў — а цяпер абмяркоўваюцца і змяненні ў Выбарчы кодэкс — да яго падключыліся дэпутаты ўсіх узроўняў і члены Савета Рэспублікі. У гэтым нумары мы сабралі меркаванні ўдзельнікаў дыялогавых пляцовак, якія падзяліліся і атмасферай, у якой яны праходзілі, і ўласным бачаннем маючых адбыцца заканадаўчых навацый.**

## Размова на роўных

**З адным з сенатараў — старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па заканадаўстве і дзяржаўным будаўніцтве Сяргеем СІЎЦОМ — карэспандэнт «МС» працавала на дзвюх цікавых сустрэчах — з навучэнцамі Мінскага каледжа электронікі і супрацоўнікамі Мінскага аўтамабільнага завода. Розныя мэтавыя аўдыторыі, розныя ўзроставыя катэгорыі, але гутарка і там, і там адбылася плённая.**

Адной з тэм сустрэчы сенатара з педагагічным калектывам і навучэнцамі стала інфармаванне аб асноўных навацыях, якія адлюстраваны ў законапраекце аб УНС.

— Новы закон датычыцца фарміравання новай мадэлі палітычнай сістэмы нашага грамадства. У ім будуць адлюстраваны найлепшыя практыкі прадстаўнічай дэмакратыі, калі ўсе групы насельніцтва без выключэння атрымліваюць правы прыняцця стратэгічных рашэнняў у развіцці грамадства і дзяржавы, — адзначыў Сяргей Сівец.

— Сустрэча ў Мінскім каледжы электронікі адбылася невыпадкова. У адпаведнасці са змяненнямі Канстытуцыі, з'явіўся новы артыкул, датычны моладзі. А менавіта — абавязацельства дзяржавы садзейнічаць духоўнаму, маральнаму і фізічнаму развіццю моладзі, ствараць умовы для рэалізацыі іх патэнцыялу, — расказаў сенатар. — Ёсць яшчэ адна катэгорыя суб'ектаў, якая атрымлівае асаблівую ўвагу ад дзяржавы паводле абноўленай Канстытуцыі, — гэта людзі з інваліднасцю і пажылыя грамадзяне. У прыватнасці, датычна асоб з абмежаванымі магчымасцямі 47-м артыкулам прадугледжана, што інваліды прыраўноўваюцца ў сваіх правах да ўсіх грамадзян нашай краіны і дзяржава спрые іх інтэграцыі ў грамадства. Мінскі дзяржаўны каледж электронікі — добры прыклад таго, як ажыццяўляюцца канстытуцыйна-прававыя палажэнні на практыцы.

Сапраўды, адной з важных адметнасцяў каледжа з'яўляецца тое, што ён дае магчымасць атрымаць адукацыю дзецям з інваліднасцю. Напрыклад, сёлета ўстанова выпускае праграмістаў: у дзяцей поўнасцю адсутнічае зрок, але яны на выдатным узроўні авалодалі ведамі. Іх вучаць з дапамогай камп'ютарнай праграмы, якая агучвае аперацыі. Але пры гэтым навучэнцы авалодваюць не толькі спецыяльнымі тэхналогіямі — іх вучаць працаваць і на звычайным камп'ютары.

*(Заканчэнне на 8-й стар.)*

ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЯ, 9

## Працаваць эфектыўна і зладжана



**ВЫНІКІ сацыяльна-эканамічнага развіцця Мінска за дзевяць месяцаў абмеркавалі на пасяджэнні Мінгарвыканкама. У мерапрыемстве прыняла ўдзел Старшыня Савета Рэспублікі, упаўнаважаная Прэзідэнта па горадзе Мінску Наталля КАЧАНАВА.**

Як адзначыла, звяртаючыся да ўсіх прысутных, спікер верхняй палаты парламента, тэзісы Прэзідэнта неабходна ведаць на памяць. Гэта датычыцца абстаноўкі як у краіне, так і ўвогуле ў свеце. «Было сказана: кожны павінен рабіць на сваім рабочым месцы ўсё магчымае, каб працаваць эфектыўна», — нагадала Наталля Качанава.

Паводле яе слоў, няма апраўдання неасваенню бюджэтных сродкаў: «Неасваенне — гэта злачынства. Трэба жорстка пытацца з тых службовых асоб, хто гэта дапускае. У горадзе ёсць пытанні, якія сёння трэба вырашаць. Напрыклад будаўніцтва новай інфекцыйнай бальніцы і інш. Перад людзьмі, якія адказваюць за гэта, павінны быць пастаўлены жорсткія задачы». Пры гэтым Наталля Качанава падкрэсліла, што за ўсё, што ёсць у горадзе, у тым ліку і за прадпрыемствы рэспубліканскай формы ўласнасці, адказвае гарвыканкам.

Старшыня Савета Рэспублікі звярнула ўвагу на тое, што найбольш важна для горада выканаць два паказчыкі: ВРП (валавы рэгіянальны прадукт. — **«Зв.»**) і інвестыцыі. «У Мінска сёння вялікі патэнцыял — працоўныя рэсурсы, сродкі — і няма ніякіх перадумоў, каб якія-небудзь паказчыкі і заданні не выконваліся, — заўважыла яна. — Трэба ўсім працаваць зладжана, на вынік. Людзей трэба падтрымліваць, але яны павінны разумець, што трэба працаваць».

Што датычыцца пытання занятасці насельніцтва, якое таксама абмяркоўвалася падчас пасяджэння, па словах Наталлі Качанавай, трэба задзейнічаць грамадзян, якія не занятыя ў эканоміцы. Пастаўлена задача — трымаць на кантролі і своечасовасць аплаты працы.

## Стратэгічнае саюзніцтва

**НА мінулым тыдні Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА з рабочым візітам наведала Самарканд. Ва Узбекістане спікер верхняй палаты парламента прыняла ўдзел у мерапрыемствах Міжпарламенцкай асамблеі дзяржаў — удзельніц СНД, а таксама правяла шэраг сустрэч са сваімі калегамі з іншых краін.**

Падчас 54-га пленарнага пасяджэння Міжпарламенцкай асамблеі краін СНД Наталля Качанава звярнула ўвагу на тое, што ў цяперашніх рэаліях значнасць супрацоўніцтва дзяржаў — удзельніц Садружнасці Незалежных Дзяржаў узрастае ў некалькі разоў. «Навекі парodненыя агульнай сямідзесяцігадовай гісторыяй, мы дагэтуль глыбока прасякнуты адзіным грамадска-палітычным духам і шчыльна злучаны эканамічнымі артэрыямі, — адзначыла парламентарый. — Наша стратэгічнае саюзніцтва жыццёва неабходна нам і ўсім маральна свабодным ад глабалісцкага дыктату краінам і народам».

Па словах Старшыні Савета Рэспублікі, адказам на выклікі сучаснасці павінна стаць актывізацыя міжпарламенцкага ўзаемадзеяння на постсавецкай прасторы. «Мы павінны быць як ніколі адзіныя — дэманстраваць прынцыповасць у сумесных падыходах і аказваць адзін аднаму гарантаваную падтрымку на міжнародных пляцоўках».

Наталля Качанава таксама прыняла ўдзел у сустрэчы кіраўнікоў парламентаў дзяржаў — удзельніц Еўразійскага эканамічнага саюза, якая адбылася ў Самаркандзе ў рамках сесіі Міжпарламенцкай асамблеі краін СНД. Асноўнай тэмай гутаркі стала правядзенне ў 2023 годзе сумеснага маладзёжнага культурна-адукацыйнага праекта «Цягнік Памяці».

**Вераніка КАНЮТА.**

# ПАЛІТЫЧНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 7-й стар.)*



Дзякуючы інклюзіўным сродкам, дзеці з парушэннямі слыху, а таксама апорна-рухальнага апарату вучацца майстэрству фатаграфіі. Каледж дае навыкі адразу ў некалькіх напрамках: рэстаўрацыя старых фотаздымкаў, разуменне тэхнічных сродкаў і непасрэдна ўменне здымаць.

— Гэта першая група па дадзенай спецыяльнасці, — адзначыў **дырэктар Мінскага дзяржаўнага каледжа электронікі Георгій КОЗЕЛ**. — Мы самі знаходзім педагогаў для такіх дзетак, самі працаўладкоўваем іх і пасля суправаджаем яшчэ два гады. Для нас самае галоўнае пытанне і мэта ў тым, каб гэтых дзяцей узялі на работу. Мы павінны фарміраваць асяроддзе, у якім кожны кіраўнік будзе ганарыцца тым, што ў яго камандзе ёсць работнік з асаблівасцямі.

У сваю чаргу, Сяргей Сівец падкрэсліў, што атрыманую інфармацыю абавязкова перадасць у Прэзідыум Савета Рэспублікі: інклюзія ў навучанні — адна з тэм, якой верхняя палата парламента і яе кіраўніцтва аддаюць асаблівую ўвагу.

***

Сур'ёзная размова адбылася і на Мінскім аўтамабільным заводзе.

— Мы разам з вамі перажываем вельмі важны этап для нашай краіны. Наша мэта заключаецца ў тым, каб акумуляваць усе ініцыятывы і прапановы, якія пачулі ў рамках шматлікіх дыялогавых пляцовак, — паведаміў Сяргей Сівец. — Яшчэ раз падкрэслю: нам вельмі важна пачуць зваротную сувязь, зразумець, як грамадзяне нашай краіны бачаць палітычную трансфармацыю.

Сенатар адзначыў, што ў Беларусі ўжо ёсць добры вопыт грамадскага абмеркавання такіх важных нарматворчых дакументаў. Тым не менш, прынццэ законапраектаў суправаджаецца рознымі пытаннямі ад грамадзян. Напрыклад, пытанне фарміравання УНС:



— Парадыгма, якая лягла ў аснову інтэгравання УНС у палітычную сістэму Беларусі, — прадстаўлене інтарэсаў усіх слаёў нашага насельніцтва. Таму падчас фарміравання нашай мэтай быў максімальны ахоп прадстаўнікоў трох галін улады: заканадаўчай, выканаўчай і судовай; прадстаўнічых органаў улады і прадстаўнікоў суб'ектаў грамадства, — распавёў Сяргей Сівец.

Яшчэ адно пытанне, якое гучала ў рамках дыялогавых пляцовак, — роля УНС у палітычным жыцці грамадства і яго адрозненне ад Нацыянальнага сходу Беларусі. Сенатар падкрэсліў, што асноўнай адметнасцю Нацыянальнага сходу з'яўляецца наяўнасць заканадаўчай улады. Зона адказнасці Нацыянальнага сходу — падрыхтоўка і прыняцце законаў, якія з'яўляюцца асноўным нарматыўным рэгулятарам грамадскіх адносін:

— УНС — суб'ект права заканадаўчай ініцыятывы, гэта значыць можа ініцыіраваць прыняцце тых ці іншых законаў шляхам звароту ў Палату прадстаўнікоў. Яны разыходзяцца па прававым статусе, — расказаў дэпутат. — Акрамя таго, Усебеларускі народны сход будзе рэалізоўваць паўнамоцтвы па стратэгічным накіраванні грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны.

**Арына КАРПОВІЧ.**
**Фота Максіма ЗМАЧЫНСКАГА і Лізаветы ГОЛАД.**

## «Дэлегатамі УНС павінны быць людзі, якія гатовыя ўзяць на сябе адказнасць за краіну»



Фота Маргарыты УШКЕВІЧ.

**Алена ПАСЮТА, старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў:**

— Праект закона «Аб Усебеларускім народным сходзе» распрацаваны ўпершыню. Такі падыход звязаны з асноўнымі прынцыпамі народнай улады і дэмакратыі. Таму што ў склад дэлегатаў, згодна з праектам закона, будуць уключаны дэпутаты розных узроўняў — 350 чалавек. Яшчэ 400 чалавек — прадстаўнікі грамадства, якія будуць абраны на месцах. Сход аб'ядноўвае дэлегатаў з усіх рэгіёнаў і пластоў насельніцтва. Гэта значыць, кожны дэпутат, кожны дэлегат будзе прадстаўляць розную праслойку насельніцтва, але ўсе будуць акумулявацца на рашэнні вызначаных задач. Такі падыход дазволіць разам прымаць рашэнні, а прыняўшы, іх выконваць.

Прыкладам народнай дэмакратыі з'яўляецца і наступнае абмеркаванне прынятых рашэнняў, калі іх сутнасць дэлегаты будуць даносіць сваім выбаршчыкам. Сход УНС — своеасаблівая апора для народы і ўлады. Менавіта на рашэнні народнага сходу змогуць абапірацца дзяржаўныя органы ў сваёй рабоце. Будзе лягчэй працаваць заканадаўчай і выканаўчай уладам. Падчас сходу будзе магчымасць вынесці на абмеркаванне тыя праблемы, якія не заўсёды могуць закрануць заканадаўцы.

Важныя палажэнні, лічу, датычацца кампетэнцыі УНС. У прыватнасці, зацвярджэнне праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця, а таксама кірункаў знешняй і ўнутранай палітыкі. Гэта даволі адказны крок для дэлегатаў УНС. Яны будуць вырашаць, якім курсам варта ісці краіне. Зыходзячы з гэтага, у далейшым будуць распрацоўвацца тыя ці іншыя законы.

Асаблівай увагі заслугоўваюць моманты, звязаныя з пытаннямі выбараў — іх легітымнасці, а таксама пытаннямі зняцця прэзідэнта ў выніку нейкіх парушэнняў. І сход павінен узяць на сябе такую адказнасць. Як і ў прыняцці рашэнняў аб увядзенні на тэрыторыі Беларусі надзвычайнага альбо ваеннага становішча пры наяўнасці падстаў, якія прадугледжаны Канстытуцыяй. Гэта пытанні высокага ўзроўню і адказнасці.

Мне задаюць пытанне: ці не будзе закон аб УНС падмяняць Канстытуцыю? Бо сам УНС — гэта канстытуцыйны статус, ён унесены як асобны раздзел у Асноўны Закон Беларусі. Трэба сказаць, што падмены тут ніякай няма, бо новы законапраект пашырае гэты раздзел, падрабязна яго трактуе і тлумачыць. Дазваляе больш асэнсавана падысці да раздзела, які быў унесены ў Канстытуцыю пасля рэферэндуму, што праходзіў у лютым гэтага года.

Напрыклад, у Канстытуцыі ў раздзеле 3.1 дадзена вызначэнне УНС — хто можа стаць дэлегатам, тэхналогіі правядзення сходу. У прыватнасці, прапануецца збірацца не менш за адзін раз на год. Новы законапраект дае больш разгорнутыя тлумачэнні.

Так, у Канстытуцыі толькі 6 артыкулаў, звязаных з дзейнасцю УНС, а законапраект — гэта 42 артыкулы, якія раскрываюць сутнасць дадзенага органа. Акрамя кампетэнцый, ёсць артыкулы стратэгічна праграмнага характару, у іх канкрэтна прапісана, якія пытанні будуць разгледжаны больш дэталёва.

Увогуле развіццё грамадства дазваляе нам казаць аб сваім унікальным падыходзе ў рэалізацыі дэмакратыі ў нашай краіне. Прэзідэнт тлумачыць, што народны сход ніякім чынам не будзе перасякацца з існуючымі галінамі ўлады. Гэта асобны орган, які будзе выконваць канкрэтныя задачы. Быць дэлегатам — высокая місія. Абраннік сходу павінен адчуваць адказнасць за прыняцце рашэнняў і добрасумленна іх выконваць.

Як прадстаўнік дэпутацкага корпуса хачу звярнуцца да сваіх калег. Лічу, што ўсе дэпутаты павінны паказаць сваю якасную работу. Для гэтага трэба актыўна працаваць на месцах, у СМІ, выязджаць у рэгіёны, браць удзел у вырашэнні зваротаў грамадзян. Час няпросты, ён патрабуе ад дэпутатаў у тым ліку актыўнасці, уключэння ва ўсе працэсы. Мы адчуваем адказнасць за будучыню нашай краіны, за той курс, які мы абралі і якім будзем ісці.

## «УНС — апора і для народа, і для ўлады»



**Максім ГУРЫН, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі, старшыня Магілёўскага гарсавета дэпутатаў:**

— У лютым краіна прагаласавала за ўнясенне заўваг і дапаўненні ў Асноўны Закон, у тым ліку ўключэнне ў яго склад раздзела аб УНС. Людзі першапачаткова выступалі за наданне Усебеларускаму народнаму сходу асаблівага статусу, актыўна ўдзельнічалі ў фарміраванні прапаноў у праект Канстытуцыі, рабілі заўвагі, выказвалі свае пажаданні. Цяпер, калі наступіў перыяд абмеркавання законапраекта і была магчымасць задаць распрацоўшчыкам пытанні, магіляўчане гэтым актыўна карысталіся. Нашаму грамадству ўжо звыклыя такія фарматы, як дыялогавыя пляцоўкі, дзе вельмі зручна весці размову і кожнаму разабрацца, як будзе працаваць гэты механізм. Кожны павінен ведаць асаблівасці выбарчага працэсу, дзеяння нарматыўных дакументаў.

Паколькі дэлегатамі УНС могуць быць розныя катэгорыі прадстаўнікоў нашага грамадства — а гэта і члены грамадскіх аб'яднанняў, партый, і дэпутаты рознага ўзроўню — людзі, якім грамадзяне дэлегіравалі свае паўнамоцтвы прадстаўляць іх інтарэсы, дыялог атрымаўся з улікам інтарэсаў усіх і разуменнем найважнейшых працэсаў. Пытанні з месцаў паступалі з веданнем, што меркаванне кожнага грамадзяніна будзе выслухана і ўлічана. Яны датычыліся фарміравання самой структуры УНС, працэсу вылучэння. Людзі пыталіся, ці будзе на УНС прадстаўлена моладзь, прадстаўнікі працоўнага класа, задавалі іншыя пытанні, якія пацвярджаюць зацікаўленасць і глыбокае жаданне магіляўчан удзельнічаць у прыняцці рашэнняў, важных для нашай Айчыны.

Абмеркаванне законапраекта аб УНС на працягу апошніх дзён было адным з галоўных пытанняў. Нам вельмі важна было пачуць меркаванне грамадзян аб паўнамоцтвах Усебеларускага народнага сходу і ролі гэтага канстытуцыйнага органа ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Бо асноўная мэта найвышэйшага прадстаўнічага органа — максімальны ўдзел у кіраванні краінай яе грамадзян праз прамое прадстаўніцтва, забеспячэнне максімальнага народаўладдзя.

Новы законапраект дазволіць раскласці ўсё па палічках і зазначыць, што кожны грамадзянін і патрыёт нашай краіны мае права на голас, які ў далейшым будзе пачуты.

Як адзначыў Прэзідэнт нашай краіны на нарадзе 20 кастрычніка, УНС павінен аб'яднаць дэлегатаў ад усіх рэгіёнаў і слаёў насельніцтва, прадстаўнікоў улады і нашага грамадства. Разам, талакой можна пераадолець любыя перашкоды, знайсці выйсце з самай складанай сітуацыі. Сход — апора і для народа, і для ўлады. Важна, каб непасрэдна грамадзяне прымалі рашэнні, на якія потым будуць абапірацца дзяржаўныя органы.

# ВАЧЫМА ГРАМАДЗЯН

## Па прынцыпе сацыяльнай справядлівасці



**Надзея БЕЛАСТОЦКАЯ, дэпутат Гомельскага раённага Савета дэпутатаў, дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Гомельскага раёна:**

— На тэрыторыі Гомельскага раёна прайшла маштабная дыялогавая пляцоўка, прысвечаная абмеркаванню праекта закона «Аб Усебеларускім народным сходзе». У сустрэчы ўзялі ўдзел дэпутаты розных узроўняў і сельская моладзь — прадстаўнікі маладзёжных саветаў пры сельвыканкамах. Магчымасць пачуць кампетэнтныя думкі аб законапраекце, падзяліцца сваімі заўвагамі і прапановамі, упэўненая, важная і для жыхароў аддаленых сельскіх населеных пунктаў, пажылых людзей. Як дэпутат па Цярэніцкай выбарчай акрузе № 3 Гомельскага раёна, у межах штомесячнай работы з выбаршчыкамі вырашыла таксама правесці сустрэчу па абмеркаванні законапраекта. Нягледзячы на тое, што будучыня Усебеларускага народнага сходу сёння вельмі шырока абмяркоўваецца, у вяскоўцаў застаюцца пытанні па сутнасці фарміравання гэтага органа народаўладдзя. Для многіх, асабліва пажылых людзей, напрыклад, не ўсе прававыя нюансы новага законапраекта зразумелыя. Але ўсім цікава разабрацца ў дадзеным пытанні, людзі абапіраюцца на меркаванні прадстаўнікоў улады. Для мяне як чалавека, які больш за 25 гадоў працуе ў сістэме сацыяльнай дапамогі насельніцтву, вельмі важна, што Усебеларускі народны сход — орган, у аснове якога ляжыць прынцып сацыяльнай справядлівасці. Многім вяскоўцам таксама блізкае тое, што Усебеларускі народны сход як орган дзяржаўнага кіравання будуць прадстаўляць людзі розных узроставых катэгорый, рознага жыццёвага досведу, прадстаўнікі розных сацыяльных груп і розных прафесій. Усебеларускі народны сход дасць унікальную магчымасць удзельнічаць у вырашэнні дзяржаўных пытанняў для любога актыўнага прадстаўніка грамадзянскай супольнасці.

## Знайсці адказы на актуальныя пытанні

**Марыя АФАНАСЕНКА, дэпутат Брэсцкага абласнога Савета, дырэктар Гвозніцкай сярэдняй школы Маларыцкага раёна:**

— Сёння ў нашым грамадстве працягваецца абмеркаванне законапраектаў аб Усебеларускім народным сходзе і Выбарчым кодэксе. Сваё меркаванне можа выказаць кожны грамадзянін, тым самым паўдзельнічаць у прыняцці лёсавызначальных рашэнняў.

У ліку іншых дэлегатаў я прадстаўляла Маларыцкі раён на пятым Усебеларускім народным сходзе. Пытанні якасці ведаў вучняў, развіццё профільнай адукацыі, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне, прафарыентацыйная работа, сацыяльная абароненасць настаўнікаў, лёс малакамплектнай сельскай школы, стварэнне новых рабочых месцаў у сельскай мясцовасці, павелічэнне пенсіённага ўзросту для работнікаў, занятых на вытворчасці са школьнымі ўмовамі, — праблемы, якія былі найбольш вострымі, хвалявалі мяне як дырэктара ўстановы адукацыі і дэпутата, які прадстаўляе сваіх выбаршчыкаў. Адказы на многія свае пытанні я атрымала ў выніковых дакументах сходу. Менавіта праграма стратэгіі развіцця Беларусі, разлічаная на пяць гадоў, прынятая на Усебеларускім народным сходзе, прадугледжвае вырашэнне большасці з названых праблем.

Што чакаю я і мае выбаршчыкі ад новага складу УНС? Паспрабую растлумачыць. Нагадаю, што Маларыцкі раён — паўднёва-заходні пагранічны раён Брэсцкай вобласці і Беларусі. Мы жывём на мяжы з Украінай і Польшчай. У адной дзяржаве ідуць баявыя дзеянні, у другой іх актыўна падтрымліваюць. Сярод маларытчан шмат выхадцаў з Украіны, якія звязалі свой лёс з Беларуссю, але маюць родных і блізкіх у суседняй краіне. Падзеі апошніх месяцаў успрымаюцца імі з болем і трывогай. Вельмі часта ў гутарках з выбаршчыкамі чую занепакоенасць тым, ці зможам мы ў сябе ў краіне захаваць мір і спакойнае, бяспечнае жыццё. Менавіта гэта, галоўнае для ўсіх нас, можна знайсці ў вызначэнні прававога статусу і канцэпцыі Усебеларускага народнага сходу, які забяспечвае непарушнасць канстытуцыйнага ладу, грамадзянскую згоду, зацвярджае асноўныя кірункі ўнутранай і знешняй палітыкі, канцэпцыю нацыянальнай бяспекі.



Асабліва важным лічу той факт, што трэцюю частку дэлегатаў сходу плануецца вылучаць з грамадзянскай супольнасці. Гэта значыць, што любы беларус, які мае актыўную грамадзянскую пазіцыю, удзельнічае ў рабоце грамадскай арганізацыі, можа стаць дэлегатам УНС і прычыніцца да прыняцця найважнейшых для краіны рашэнняў.

Жыхары Маларыцкага раёна выказалі сваё меркаванне аб неабходнасці Усебеларускага народнага сходу яшчэ ў лютым 2022 года на рэспубліканскім рэферэндуме па пытаннях унясення змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь. Абсалютнай большасцю галасоў пры яўцы 89 працэнтаў маларытчане выбралі для сябе і сваіх дзяцей стабільнасць у грамадстве, мірную, квітнеючую Беларусь.

## «Стабілізаваць грамадства і дзяржаву»

**Алеся СІНЯКОВА, выконваючая абавязкі старшыні Заронаўскага сельсавета Віцебскага раёна:**



— Усебеларускі народны сход стаў асаблівай формай народаўладдзя, дэмакратычным інстытутам, які дазволіў грамадзянам Беларусі больш шырока рэалізоўваць права ўдзелу ў справах дзяржавы — не толькі праз выбары розных узроўняў і рэферэндумы, дзейнасць парламента і мясцовых Саветаў дэпутатаў, камунікацыю з выбраннікамі.

На сённяшні дзень прамых аналагаў УНС у палітычных сістэмах іншых краін не знайсці. Ні ў адной дзяржаве няма такога органа, дзе прадстаўнікі працоўных калектываў, грамадскіх арганізацый могуць браць непасрэдны ўдзел у палітычным жыцці сваёй краіны на такім высокім узроўні. Усе настроеныя на такую палітычную рэформу, чакаюць яшчэ больш эфектыўнага кіравання. Каб жыццё наша паляпшалася, якасць яго павышалася. Мяркуючы па настроі ў працоўных калектывах, усе ўпэўнена глядзяць у заўтрашні дзень.

Важна данесці да ўлады праблемы і пытанні, якія паступаюць ад насельніцтва. Вырашаць талакой і раіцца з людзьмі — гэтак прынята ў беларусаў. І гэта правільна. Разам — мы сіла. Прынцып прамога народаўладдзя будзе рэалізаваны падчас прыняцця дадзенага закона. І народ яго абавязкова падтрымае. Важна, што ў склад сходу можа ўвайсці любы абраны народам беларус, якому неабыякавы лёс краіны: прадстаўнікі актыўнай моладзі, перадавікі працоўных калектываў, ветэраны, якія сваімі справамі на карысць краіны заслужылі грамадскі аўтарытэт.

Усебеларускі народны сход важны не толькі сам па сабе. Выключна важная яшчэ і тая работа, якая вядзецца на падыходах да форуму: дыялогавыя пляцоўкі, збор меркаванняў і прапаноў ад прадстаўнікоў самых розных сфер па пытаннях далейшага развіцця краіны, уключаючы эканоміку, грамадска-палітычны лад. Больш за тыдзень у працоўных калектывах ішло абмеркаванне праекта закона «Аб Усебеларускім народным сходзе», нашы грамадзяне актыўна бралі ўдзел у дыскусіях, уносілі свае прапановы — гэта яшчэ адзін паказчык таго, што беларусы ўсведамляюць: кожны з нас нясе адказнасць за свой выбар і вырашае, у якой краіне будуць жыць яго дзеці.

УНС не ўваходзіць ні ў адну з галін дзяржаўнай улады. Ён як бы стаіць над усімі галінамі ўлады і з'яўляецца своеасаблівым страхуючым элементам, своеасаблівым арбітрам у выпадку нейкіх магчымых рознагалоссяў, вострых сітуацый паміж рознымі галінамі ўлады. Тое, што такія абвастрэнні могуць быць, не выключаецца, таму сход якраз і павінен згладжваць такія канфлікты, вырашаць супярэчнасці і стабілізаваць само грамадства і дзяржаву. Якраз у гэтым і ёсць яго вызначальная роля.

Некаторыя сумняваюцца, маўляў, дадатковы прадстаўнічы орган народаўладдзя будзе залішні, што ён дублюе паўнамоцтвы парламента. Я не падзяляю такіх думак і лічу, што толькі народ як крыніца ўлады павінен вызначаць колькасць сваіх прадстаўнічых органаў, іх функцыі і паўнамоцтвы. Усебеларускі народны сход выйшаў з нашага гістарычнага веча, гэта наш генетычны код.

## «Любое грамадства павінна рухацца наперад»



**Пётр БІБІК, старшыня Валожынскага раённага Савета дэпутатаў:**

— Жыхары нашага раёна бралі актыўны ўдзел у абмеркаванні прапанаваных законапраектаў. У сваю чаргу, мы імкнуліся ахапіць як мага больш шырокую аўдыторыю. Менавіта ад актыўнай грамадзянскай пазіцыі людзей у далейшым будзе залежаць лёс краіны і наш агульны дабрабыт. А каб закон стаў дзейсным і эфектыўным, ён павінен стаць народным. Таму неабходна параіцца з народам. Яшчэ напярэдадні падрыхтоўкі да рэферэндуму па ўнясенні змяненняў і дапаўненняў у Канстытуцыю мы правялі шмат мерапрыемстваў, сустрэч, у якіх узялі ўдзел грамадзяне розных узростаў, прафесій. На ўсе запыты яны атрымалі вычарпальныя адказы. Таму асаблівых пытанняў цяпер у іх не ўзнікае.

Людзей найбольш цікавіла, хто можа ўвайсці ў склад Усебеларускага народнага сходу, якая будзе сістэма адбору і як будзе ісці яго фарміраванне, як будзе арганізавана працэдура прыняцця рашэнняў, роль сходу ў сістэме ўлады. Людзі цікавіліся таксама, чым выклікана прыняцце новага Выбарчага кодэкса. Вядома, мы маглі б жыць і з тым, што ёсць. Але любое грамадства павінна развівацца, рухацца наперад. Мяняюцца часы, абставіны і мы павінны ісці ў нагу з часам. Выбарчы кодэкс мяняецца, і грамадзяне павінны разумець, як будзе весціся выбарчы працэс. Сярод навацый — адзіны дзень галасавання, што пасадзейнічае ўпарадкаванню выбараў дэпутатаў Саветаў розных узроўняў. Устаноўлены таксама дакладныя тэрміны правядзення выбараў — апошняя нядзеля лютага. Гэта дазволіць скараціць колькасць выбарчых кампаній, акруг і ўчастковых камісій, сэканоміць не толькі сродкі, але і людскія рэсурсы. Гэта, лічу, вельмі правільна.

**Запісалі спецыяльныя карэспандэнты: Нэлі ЗІГУЛЯ, Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ, Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, Маргарыта УШКЕВІЧ, Наталля КАПРЫЛЕНКА, Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# ЖЫЦЦЁВЫЯ ЎНІВЕРСІТЭТЫ СТАРШЫНІ СЕЛЬВЫКАНКАМА

## Як чатыры дзесяцігоддзі заставацца вернай сваёй справе

**ТОЛЬКІ за апошнія гады амаль двума мільёнамі праглядаў на YouTube адзначана кінастужка Беларусьфільма 1959 года «Строгая жанчына». Вось так больш чым праз паўстагоддзя па-ранейшаму кранае гледача душэўная гісторыя пра старшыню сельсавета з беларускай глыбінкі. І ў наш час у самым аддаленым рэгіёне Гомельскага Палесся жыве жанчына, праз лёс якой можна прасачыць станаўленне органаў кіравання і самакіравання ў Беларусі. Зняць фільм ці напісаць кнігу смела можна пра Тацццяну Касцюкевіч. Амаль 40 гадоў яна ўзначальвала сельскі Савет дэпутатаў у вёсцы Сіманічы Лельчыцкага раёна. Перажывае Тацццяна Пятроўна за родную вёску, марыць, каб яна жыла-развівалася і цяпер.**



### «Чырвоны дыплом»

Сёння ў Лельчыцкім раёне Гомельшчыны ўраджэнка вёскі Сіманічы Тацццяна Касцюкевіч — вядомая на ўсю акругу траўніца. Аматарка «прыроднай аптэкі», а яшчэ надзвычай фотагенічная жанчына, яна не раз была героем фотарэпартажаў (у тым ліку для «Звязды») аб збіранні траў на Палессі. Але цікавая гісторыя жыцця Тацццяны Касцюкевіч і як кіраўніка на вёсцы.

«Чырвоны дыплом» агранома Краснабярэжскага сельскагаспадарчага тэхнікума. А пасля адразу ж — трэці курс біялагічнага факультэта Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта, які толькі-толькі адкрыўся...

Мая суразмоўніца дагэтуль памятае адчуванне маладога чалавека, які атрымаў вышэйшую адукацыю і вяртаецца жыць і працаваць на вёску.

— Уявіце, пачатак 1970-х гадоў, у маіх родных Сіманічах не было тады людзей з вышэйшай адукацыяй. Пасля тэхнікума ва ўніверсітэт я паступіла без іспытаў — увайшла ў 5 % студэнтаў, якія як выдатнікі вучобы ў тэхнікуме паступалі «аўтаматам».

Муж Тацццяны Касцюкевіч (былі з адной вясковай школы) Аляксандр якраз скончыў Усесаюзны інстытут аховы раслін у Санкт-Пецярбургу.

— Вельмі добра памятаю адчуванне радасці, што можаш вучыцца, задавальненне ад атрымання ведаў, — дзеліцца Тацццяна Пятроўна.

> Уявіце канец 1980—1990-я гады, не хапае медыкаў. Я не здаюся і ўзнімаю ўвесь час гэтае пытанне на ўзроўні кіраўніка раёна, звяртаемся ў вобласць. Хочацца адзначыць, як могуць кіраўнікі ўсіх узроўняў імкнуцца вырашыць сітуацыю, нават праз нестандартныя рашэнні. Пастуae прапанова адабраць 25 найлепшых вучняў нашага Лельчыцкага раёна, якія змогуць паехаць у Мінск на падрыхтоўчыя курсы перад паступленнем у медыцынскі ўніверсітэт. Галоўная задача — падрыхтаваць новыя кадры для сельскай мясцовасці. Так і зрабілі. І нашых найлепшых дзяцей забралі вучыцца па профілі ў Мінск у СШ № 12. Яны рыхтаваліся, а экзамены, якія здалі, былі залічаны як уступныя ў медыцынскі ўніверсітэт.

### Запіска ад кіраўніка абкама

Калі маладыя спецыялісты вярнуліся ў вёску з дыпломамі ВНУ, прыйшло і дакладнае разуменне: ты чалавек дзяржаўны, павінен паказваць прыклад іншым, браць на сябе адказнасць.

— Мне вельмі падабалася работа настаўніка. Калі абараніла дыплом у Гомелі, вярнулася ў кватэру, а там запіска для мяне: прасілі прыйсці ў аблвыканкам. Я ж чалавек адказны — прыйшла. Сабралі там шмат маладых спецыялістаў. Пагаварылі з намі аб важнасці работы на месцах. Я вярнулася аўтобусам на аўтастанцыю ў Лельчыцы, а па гучнагаварыцелі, як у кіно, аб'яўляюць маё імя і прозвішча. Дыспетчар кажа, каб грамадзянка такая вось не садзілася ў аўтобус на Сіманічы, бо па яе прыедзе машына. Я спалохалася, шчыра кажучы, — згадвае мая суразмоўніца.

Так на калгасным «уазіку» — самай хадавой у тыя часы машыне — проста з дарогі Тацццяна Пятроўна трапіла на сесію сельскага Савета дэпутатаў, дзе яе адразу абралі старшынёй Сіманіцкага сельвыканкама і сельскага Савета дэпутатаў.

### Зайшла «на мінутку», засталася на 37 гадоў

— Цяпер смешна ўспамінаць, але я не зусім зразумела, што адбываецца, што за працэдуру праводзяць на сесіі. Заяў я ніякіх не пісала, кандыдатуру сваю не прапаноўвала на пасаду. Раніцай пасля сходу пайшла ў сельсавет, таму што лета, у мяне настаўніцкі водпуск, думаю, даведаюся, што рабіць пасля ўчарашняй нарады. Прыйшла, а ў сельсавеце нікога. Пачакала. Прыйшоў мужчына і пачаў скардзіцца, што ў яго агарод затапіла, разбірайцеся, маўляў, суседзі вінаватыя. Пастаяла, паслухала і пайшла разбірацца, ды так і засталася амаль на сорак гадоў, — дзеліцца Тацццяна Пятроўна.

У вёсцы, калі яна стала старшынёй сельсавета, не было ні дзіцячага садка, ні клуба, ні бальніцы.

— Была школа-сямігодка. Было шчырае жаданне працаваць і былі людзі, з якімі разам не было страшна брацца за рашэнне любых задач, — дадае Тацццяна Касцюкевіч.

Пасля адкрылі ў іх Сіманічах і сярэднюю школу, сельскі клуб (круцілі танцы, на якія з'язджаўся ўвесь раён), бібліятэку, музычную школу, амбулаторыю з аддзяленнем сястрынскага догляду. Яшчэ да прыняцця ўказа аб стварэнні аграгарадкоў гэты аддалены куток Гомельскага Палесся лічыўся вёскай будучыні, эталонам развіцця сельскіх населеных пунктаў.

Тацццяна Касцюкевіч усіх жыхароў вёсак, размешчаных на тэрыторыі яе сельсавета, ведала ці не пайменна. Ведала, чым і як жыве кожная сям'я. Тацццяна Пятроўна стала для вяскоўцаў чалавекам, якому шчыра давяралі, ад якога чакалі дапамогі, прасілі парады з любых жыццёвых справах.

Аўтарытэтным і паважаным чалавекам сіманіцкая старшыня сельсавета стала і для сваіх калег па рабоце.

— Дырэктар сіманіцкага сельскага клуба Адам Жукевіч, супрацоўнікі сельвыканкама — Любоў Боб і Любоў Федаровіч — людзі, якім я шчыра ўдзячная за работу. Усё сваё жыццё яны аддалі рабоце ў нашых Сіманічах. Мы называлі гэта не работай, а рашэннем галоўных задач жыцця, — узгадвае Тацццяна Пятроўна.

### Узоры жыцця

У 1990-я гады, пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС, калі ў палескай глыбінцы катастрафічна не хапала медыкаў, Тацццяна Касцючэнка прыкладам сваёй самаадданай работы натхніла прыехаць працаваць у Сіманавічы маладога ўрача Юлію Верасовіч. Юлія Леанідаўна — карэнная мінчанка, дачка ваеннага ўрача, першы доктар, які ў цяжкі для вёскі час узначаліла мясцовую бальніцу. Усё жыццё яна аддала рабоце менавіта ў Сіманічах, падкрэслівае Тацццяна Пятроўна і звяртае ўвагу, як праз жыццё вёскі можна прасачыць развіццё ўсяго нашага грамадства, нашай краіны.

